Залукі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Дзям'ян Свентахоўскі ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 45 (2843) Год LV | Беласток, 7 лістапада 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Калі б мяне выбралі бурмістрам Гайнаўкі, маю намер спатыкацца з гайнавянамі, слухаць іх заўваг і карыстацца імі ў сваёй працы. Самы вялікі патэнцыял нашага горада гэта людзі, іх моц, энергія, працавітасць, вынаходлівасць і я хацеў бы як найбольш інвеставаць у людзей, каб вызваліць у іх энергію да працы і дзейнасці ў карысць горада.

ПРЫЙШОЎ ЧАС НА СВЕЖАСЦЬ

Мінуў час рэгістрацыі кандыдатаў на бурмістраў і войтаў. Цяпер стала вядомым, што за пасаду бурмістра Гайнаўкі будзе змагацца 5 чалавек, у ліку якіх Міраслаў Раманюк — адзіны беларус, які балатуецца са спіска ПСЛ. Згадзіўся ён паразмаўляць наконт сваіх планаў, якія хацеў бы рэалізаваць, стаўшы бурмістрам Гайнаўкі.

— Восем гадоў таму Вы ўключыліся ў самаўрадавую дзейнасць і як кандыдат на павятовага раднага ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта адразу атрымалі велізарную падтрымку жыхароў Гайнаўскай, Чыжоўскай і Белавежскай гмін, каля 800 галасоў і як лідар з гэтай акругі сталі павятовым радным. У 2006 годзе, як лідар гарадскога спіска Беларуска-народнага камітэта, атрымалі Вы ў самаўрадавым галасаванні вялікую падтрымку і паўторна сталі павятовым радным, якім з'яўляецеся да гэтай пары. Ці вялікая падтрымка мясцовага грамадства і вопыт у самаўрадавай дзейнасці мелі ўздзеянне на Вашае рашэнне стаць кандыдатам на бурмістра Гайнаўкі?

— У мяне васьмігадовы вопыт павятовага раднага. Людзі сталі гаварыць, што бачылі б мяне на пасадзе бурмістра Гайнаўкі і хацелі б, каб я ўвеў свежасць у самаўрадавую дзейнасць. Нават на спіску ПСЛ кандыдатаў у гарадскіх радных выдатная большасць. Гэта маладыя людзі. Я думаю, што прыйшоў час, каб зрабіць акцэнт на моладасць, каб маладыя таксама пачалі мець рэальнае ўздзеянне на змены ў горадзе і пачалі мяняць яго выгляд на прыгажэйшы. У Гайнаўцы і на Гайнаўшчыне некаторыя людзі знаходзяцца пры ўладзе 15-20 гадоў. Думаю, што прыйшоў час на змены, на свежасць.

— Вы — беспартыйны кандыдат. Як хочаце выкарыстаць гэты козыр?

— Спадзяюся здабыць прыхільнасць людзей розных асяроддзяў. Хачу быць кандыдатам па-над усялякімі падзеламі, якія апошнім часам абвастрыліся ў Польшчы.

— Адны ў Гайнаўцы гавораць, што ўлады горада павінны развіваць турызм, іншыя лічаць, што перш за ўсё трэба падтрымліваць прамысловую дзейнасць, бо з турызму цяжка выжыць. Якой Вы бачыце будучыню Гайнаўкі?

— Я думаю, што трэба развіваць горад у двух напрамках: прамысловым і турыстычным. Прыезджыя павінны заўважыць турыстычную прывабнасць Гайнаўкі і хутка даведацца аб турыстычных паслугах і атракцыёнах горада. Важна, каб разбудаваць цэнтр горада, каб турысты і гайнавяне мелі куды выйсці, спаткацца там і адпачыць. Гайнаўка мала карыстаецца распалажэннем побач Белавежскай пушчы і пры дарозе ў турыстычную Белавежу. Калі б мяне выбралі бурмістрам, маю намер намагацца сцягнуць вонкавы капітал для інвеставання як у прамысловасць, так і ў турызм. Трэба адначасна вызваляць у нашых людзях прадпрымальніцкія здольнасці, а новыя месцы працы ў прамысловасці і турызме павінны спрычыніцца да гаспадарчага росквіту Гайнаўкі. Я хачу будаваць новае, а адначасна не разбураць таго, што было добра зробленае.

— Грамадства патрабуе перш за ўсё інвестыцый у дарожную інфраструктуру.

працяг ☞2

Фота Аляксея МАРОЗА

Міраслаў Раманюк нарадзіўся ў 1965 годзе ў Гайнаўцы, дзяцінства і юнацтва правёў у Махнатым. Спачатку вучыўся ў падставовай школе ў роднай вёсцы, а пасля паспяхова закончыў Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Гайнаўцы. Вышэйшую адукацыю здабыў у Сельскагаспадарчай акадэміі ў Любліне, а потым вучыўся на Менеджарскіх паслядыпломных студыях на Варшаўскім універсітэце. Сваю прафесійную працу распачаў з пасады кіраўніка Гайнаўскага аддзялення Касы сельскагаспадарчага сацыяльнага страхавання і працуе на ёй па сённяшні дзень. Самаўрадавай дзейнасцю займаецца з 2002 года, калі стаў дэпутатам Рады Гайнаўскага павета ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта. Быў выбраны дэлегатам Сельскагаспадарчай палаты нашага ваяводства. Пражываючы ў Новым Корніне, быў членам Царкоўнага камітэта пры Вазнесенскім прыходзе ў Новым Беразове. Жанаты, жонка Ала і дзве дачкі — Ганна і Магдалена. У Гайнаўцы жыве з 2000 года.

*Пра **Міраслава Раманюка** выказаліся вядомыя і шанаваныя ў Гайнаўцы асобы:*

— Я з чыстым сэрцам і вялікім перакананнем магу сказаць, што Міраслаў Раманюк надта працавіты чалавек і ў яго вельмі добрая арганізацыя работы, што хіба асталося ў яго па бацьку. Ён адначасна вельмі зычлівы для людзей, адкрыты на іх патрэбы і скоры да дапамогі, што магло астацца ў яго па маме. У школе не было з Міраславам ніякіх праблем выхаваўчага характару і не было на яго ніякіх скарг. Я думаю, што Міраслаў Раманюк — самы добры кандыдат на бурмістра Гайнаўкі,

— заявіла **Зінаіда Петручук**, былая настаўніца гісторыі і класны выхавацель Міраслава Раманюка ў Гайнаўскім белліцэі.

— У белліцэі Міраслаў Раманюк быў асобай інтэлігентнай і знаходлівай. Працуючы кіраўніком Касы сельскагаспадарчага сацыяльнага страхавання, ён паказаў сябе зычлівым у адносінах да наведвальнікаў. Падыдзе, паслухае старэйшую асобу і паразмаўляе з ёй. Я рэгулярна бачу Міраслава Раманюка на багаслужбах у царкве, а гэта важнае ў нашым хрысціянскім жыцці. Нічога дрэннага я не ўчуў пра Міраслава Раманюка, а выводзіцца ён з прыстойнай беларускай сям'і,

— сказаў **Васіль Сакоўскі**, былы настаўнік беларускай мовы ў Гайнаўскім белліцэі.

9 770546 196000

Небяспечныя гульні

Пашанцавала Мядзведзеву, што ён грамадзянін Расійскай Федэрацыі. Быў бы грамадзянінам Беларусі, то за тое, што піша ў сваім блогу на беларускага прэзідэнта, трапіў бы пад артыкул, які за абразу гонару і годнасці першай асобы беларускай краіны як мінімум не прадугледжвае надбаўкі ў заробку. Пад гэты артыкул ужо не адзін беларус трапіў, нават за выказванні куды больш мяккага характару. А тут такое пішацца і гаворыцца, чаго нават сам Пазьняк сабе не дазваляў. Канешне, Зянон Станіслававіч так не гаварыў з прычыны шляхетнага выхавання, і яшчэ з-за таго, што беларуская мова не перанасычаная рэзкімі фразамі замаскіравана-абразлівага характару, як расійская. Але імкнуўся сказаць тое, што думае. А што ў той час пра Аляксандра Рыгоравіча казалі расійскія кіраўнікі, варта сабе прыпомніць.

Калі кіраўнік Расіі захоча нагаварыць кепскага на начальніка беларускай дзяржавы столькі шмат, колькі ён раней рабіў і казаў добрага, то яму прыйдзецца пайсці на другі тэрмін, гаварыць кожны дзень і не змаўкаць нават уначы. І то часу наўрад ці хопіць. Колькі было ў адрас беларускага кіраўніка сказана добрага, ласкавага і цёплага! І найлепшымі стасункамі называлі адносіны беларускага і расійскага бакоў, і найлепшымі суседзямі прыкідваліся. І гандлёвы абарот усіх задавальняў, і наладжванне нібыта гвалтоўна парваных эканамічных сувязей, і нейкае незразумелае нікому паглыбленне эканомік адна ў другую. А што ўжо казаць пра падрыхтоўку да адзінай валюты, якой яшчэ Кебіч палохаў народы і нацыі. А адзіная эканамічная прастора і, як кульмінацыя абсурду, адзіная саюзная дзяржава, якая складаецца з двух несаюзных.

А колькі рускія баранілі свайго беларускага калегу на міжнароднай палітычнай арэне — так ніхто нікога не бараніў. І ўсё таму, што той сам загаварыў не па-беларуску, прымусіў цэлую нацыю размаўляць на чужой мове і выкапаў памежны слуп паміж Беларуссю і Расійскай Федэрацыяй. Тады рускія хіба думалі, што калі не будзе таго слупа, то ніхто не будзе ведаць, дзе Расія канчаецца на захадзе. Будуць, маўляў, тыя прасторы рассцілацца ажно да памежнай зоны ў Гродзенскай вобласці.

І прыляталі яны ратаваць Аляксандра Рыгоравіча ад імпічменту, і аберагалі ад міжнароднага ціску, і ад эканамічнага калапсу... І раптам іх любімчык у адно імгненне ператварыўся ў мішэнь для тэлевізійных нападак. І гэта ў той час, калі ў Беларусі пачаліся чарговыя прэзідэнцкія выбары.

Паверыць у тое, што расійскае кіраўніцтва не ведала, што ў Беларусі дэпутатаў з парламента сілком выцягвалі на вуліцу, што назіральнікаў выганялі з выбарчых участкаў, што апазіцыянеры розных роўняў уцякаюць з краіны, папросту немажліва. Але Расію гэта ўсё задавальняла. Расія гэта ўсё падтрымлівала і аплачвала. Дык ці можна цяпер паверыць у шчырасць расійскага кіраўніцтва — той улады, якая падымае самалёты на ўласныя гарады, пераследуе сваю расійскую апазіцыю, падтрымлівае недэмакратычныя рэжымы па ўсім свеце?..

Думаю, што не. І гісторыя пацвярджае гэта. Пацвярджае і пацвярджала не адзін раз і ўсе гэтую гісторыю ведаюць, і не раз на ёй апякаліся.

Дык чаму ж сённяшнія дэмакратычныя кандыдаты ў чарговы раз робяць недвухсэнсоўныя рэверансы ў бок Крамля? Няўжо яны думаюць, што Масква сапраўды паставіць хоць на нейкага дэмакрата. Калі насамрэч ёсць у каго такія спадзяванні, то гэта надзеі дзеўкі, якая думае пра хлопца-бабніка, што хай ён і падманваў іншых жанчын, але з ёй будзе ўсё паіншаму. І яе ён возьме, і будзе верны ўсё жыццё.

А ён, паводле яго характару, заўсёды будзе верны свайму бабніцтву, бо ён такі ад нараджэння і такім застанецца да скону.

А Крэмль заўсёды будзе верны свайму імперыялістычнаму памкненню і будзе такім да свайго скону. І заігрываць з ім прадстаўнікам той краіны, якую Масква хоча ўключыць у Расійскую Федэрацыю часткамі або цалкам, гэта вельмі небяспечныя гульні. Гульні, якія дабром не канчаюцца.

Віктар САЗОНАЎ

Дзе тыя людзі, дзе той час

Не ведаю чаму, але з сантыментам успамінаю 1990-я гады, час, на які выпалі маё дзяцінства і юнацтва. Тады жыццё здавалася прасцейшым. У той час шмат я чытаў кніг, многа пісаў вершаў, якія з 1996 года дасылаў на Агульнапольскі конкурс паэзіі і прозы, арганізаваны тыднёвікам „Ніва". Апрача вершаў пачынаў я пісаць песні, на словы якіх у маіх думках з'яўляліся мелодыі. У глыбіні маіх мар тоілася надзея стварыць са сваімі сябрамі беларускую маладзёжную групу, аднак не хапала грошай на навуку ігры ды куплю інструментаў. Думаў, што сваімі аўтарскімі песнямі заваюем усю Беласточчыну, падобна як зрабілі гэта „Белы сон" ці „Кардон", якія тады здабылі папулярнасць у беларусаў Беласточчыны.

Апрача вершаў і песень я з 1995 года сам выдаваў беларускую школьную газетку „Пяцёрка", якая з верасня 1996 года, калі я паступіў вучыцца ў Бельскі белліцэй, памяняла назву на „Званок". Помню як у хаце майго сябра Андрэя Красоўскага была сустрэча рэдакцыі „Званка". Аднак пасля сустрэчы аказалася, што амаль ніхто з маіх рэдакцыйных сяброў не меў часу займацца рэдагаваннем. І так я сам стаў у адной асобе галоўным рэдактарам, графікам ды публіцыстам „Званка". Гэта быў час, калі не былі яшчэ так распаўсюджаны камп'ютары як зараз і таму я быў прымушаны ўручную пісаць ды размалёўваць газетку. Змест газеткі быў на беларускай мове. У „Званку" рабіў я справазачы з сустрэч беларускіх паэтаў, пісьменнікаў ды музыкаў у нашым белліцэі. Добра памятаю як узяў я інтэрв'ю ў беларускага барда (на той час папулярнага) Андрэя Мельнікава або ў гітарыста групы „Вядро" Томка Лукашука. У „Званку" пісаў я таксама пра ўражанні ад пабыўкі на Сустрэчах „Зоркі" ў Старыне або пра Фестываль „Бардаўская восень — 1998". Апісаў я таксама аўтарскія сустрэчы паэтаў Надзеі Артымовіч ды Юрыя Баены. У „Званку" пісаў я рэцэнзіі на беларускія кнігі ды аўдыёкасеты, змяшчаў свае вершы. Час ад часу сябры дапамагалі мне ў рэдагаванні маёй газеткі, напрыклад, Андрэй Астапчук даў мне тэкст пра свае ўражанні ад пабыўкі на фестывалі „Басовішча-97". Другі мой сябар Міхась Дмітрук час ад часу даносіў мне да „Званка" беларускія жарты. Рэдагаванне беларускамоўнай газеткі было здзяйсненнем маіх мар у плане журналістыкі. Да 2000 года з'явілася 5 нумароў „Званка". Нядаўна, калі я шукаў кнігі, выпадкова натрапіў на некалькі архіўных нумароў „Званка" ды расчуліўся. У 15-18-гадовым узросце я марыў стаць журналістам, што і рэалізаваў шляхам выдавання беларускамоўнай газеткі. Гэта нічога, што ў тэкстах было шмат памылак, але гэта быў мой малы беларускі свет, якога ніхто мне не адбярэ.

Другім журналісцкім крокам было тое, што мы з найлепшым сябрам гулялі ў беларускамоўнае вясковае радыёвяшчанне. Хаця мы не мелі перадатчыка і прафесійнай апаратуры, толькі касетны магнітафон, запісвалі на касетах свае перадачы. У гэты час я любіў запісваць размовы з найстарэйшымі людзьмі ў Малінніках. Матэрыял быў практычна ў нашай хаце. Гэта былі нашы бабулі ды суседзі-старажылы, якія нам расказвалі пра маладосць ды вайну. Помню як запісваў размовы з бабуляй Марыяй Самасюк-Буйнюк або з суседам Андрэем Калішуком, інтэрв'ю з якім увайшло ў ніўскую кнігу „Бежанства 1915 года". І так мы з сябрам міксавалі размовы з беларускай музыкай ды запісвалі на аўдыёкасеты. Такім чынам я ставіў свае першыя журналісцкія крокі ды здзяйсняў свае скрытыя мары. Пасля ліцэя наступіў студэнцкі час, але гэта ўжо іншы перыяд у маім жыцці.

Юрка БУЙНЮК

1 ☞ працяг

Фота Аляксея МАРОЗА

— Трэба скончыць з калдобістымі і непраезнымі дарогамі ў Гайнаўцы, — гэта адзін з галоўных лозунгаў Міраслава Раманюка

— Трэба скончыць з калдобістымі і непраезнымі дарогамі ў Гайнаўцы, збудаваць веласіпедныя сцежкі, бо многія гайнавяне перамяшчаюцца на веласіпедах. Вельмі важнай справай з'яўляецца таксама пракладка газаправода, каб можна было абагравацъ прыватныя дамы танней і без шкоды для навакольнага асяроддзя.

— Адной з самых вялікіх праблем на працягу апошніх 20 гадоў з'яўляецца адток маладых людзей з нашага горада ў пошуках працы.

— Трэба рабіць націск на гаспадарчае і турыстычнае развіццё Гайнаўкі. Калі будзе больш новых месц працы, больш маладых асоб застанецца ў Гайнаўцы.

— У Гайнаўцы ўвогуле няма дзіцячых ясляў, а толькі ў адным садку працуюць два перапоўненыя аддзяленні для дзетак ва ўзросце да трох гадоў. Маладыя сужонствы маюць вельмі абмежаваную магчымасць атрымаць камунальныя кватэры ў блоках, бо новыя ў нашым горадзе не будуюцца.

— Трэба будзе ізноў адкрыць дзіцячыя яслі і павялічыць колькасць месц у прадшколлях, бо апошнім часам узрасла колькасць нованароджаных дзетак. Якраз сталі засноўваць сем'і маладыя людзі народжаныя ў час дэмаграфічнага піку сямідзесятых гадоў. Неабходна таксама збудаваць хоспіс для старэнькіх людзей, якімі не могуць апекавацца іх сямейнікі, бо цяперашні хоспіс у бальніцы замалы. Варта было б таксама вярнуцца да будовы камунальных жылых блокаў.

— Важна, каб чалавек, які стане бурмістрам Гайнаўкі, меў як найлепшы непасрэдны кантакт з гайнавянамі, каб разумеў іх патрэбы і кансультаваўся з імі ў найважнейшых справах. Карацей кажучы, якога стылю працы Вы хацелі б трымацца стаўшы бурмістрам?

— Калі б мяне выбралі бурмістрам Гайнаўкі, маю намер спатыкацца з гайнавянамі, слухаць іх заўваг і карыстацца імі ў сваёй працы. Самы вялікі патэнцыял нашага горада гэта людзі, іх моц, энергія, працавітасць, вынаходлівасць і я хацеў бы як найбольш інвеставаць у людзей, каб вызваліць у іх энергію да працы і дзейнасці ў карысць горада.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

На ўроку ў 2 і 3 класе

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

НЕ ДАЛІ Б РАДЫ БЕЗ ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ!

Звонку школа ў Залуках выглядае нецікава — двухпавярховы аблезлы будынак часоў рэальнага сацыялізму. Аднак калі пераступіш яе парог, адразу адчуваецца цеплыня і нейкая прыгажосць. З самага парога вітае нас этнаграфічны куточак з вышыванкамі і старымі сельскагаспадарчымі прыладамі. Абшырны калідор увесь аздоблены насценгазетамі, каляровым дэкорам, фатаграфіямі. У цэнтральным месцы лозунг: *Kto ty jesteś? Polak mały. Jaki znak twój? Orzeł biały.* Патрыятычныя радкі ілюструе выява арла з пенапласту. Школьны калідор — не проста калідор. Тут ладзяць усе вясковыя мерапрыемствы, тут адбываюцца рэпетыцыі гуртоў *Каліна* і *Калінка*, тут прымаюць гасцей з іншых школ і мясцовасцей. Сёння ў Залукі таксама прыедуць гімназісты з Гарадка, каб паказаць сваю п'есу *Як муж перастаў жонку слухаць*, паспяваць улюбёныя беларускія песні і даказаць, што беларуская мова можа ісці ў пары з польскай.

— Нашы вучні ў палове каталікі, — адзначае дырэктар Ірына Супрун, — аднак усе дзеці з першага па шосты клас вывучаюць беларускую мову.

— Многія школы, якія апынуліся пад пагрозай знікнення, прымаюць такое рашэнне, — намякаю на лакальную „тактыку".

— Але нам ідзе пра пазітыўную прамоцыю беларускай мовы, — пярэчыць мая субяседніца, — пра тое, каб людзі разумелі, што іх *простая мова* не горшая за іншыя мовы. Карысць ад гэтага падвойная, сродкі на беларускую мову выдатна папаўняюць школьны бюджэт.

* * *

Здаецца, што ў школе падрыхтаваліся пад візіт „Зоркі". Ужо на калідоры згодным хорам віталі мяне словамі: *Добры дзень!* Таксама ў настаўніцкім пакоі мы пачалі гутарку на беларускай мове. Праз момант мне здалося, што вярнулася я ў пачатак дзевяностых гадоў, калі ў Залуках усе настаўнікі камунікавалі на такой мове. Запамятаўся таксама настаўнік Францішак Апановіч. Ён адрэкамендаваў сябе беларусам-каталіком ды сказаў, што ганарыцца поспехамі іх земляка Лёніка Тарасэвіча. Зараз пазітыўную прамоцыю беларускай мовы здзяйсняюць маладыя настаўніцы Альжбета Раманчук і Марыя Панасэвіч-Дубіцкая.

— У Залуках я магу ажыццявіць кожную задуму, — кажа спадарыня Альжбета. — У час кожнага свята мы выступаем з вершамі або беларускімі песнямі.

Найбольш падабаецца ёй ангажаванасць людзей з вёскі. Сюды прыходзяць не толькі бацькі, каб палюбавацца выступленнямі дзетак. У будынак заходзяць старэйшыя жанчыны, якія з сабой прыносяць паток жывой беларушчыны, гумар ды дабрыню. Калі ў школе якое свята, кабеты, як сапраўдныя гаспадыні, на свой кошт ды ўласнаручна рыхтуюць для ўсіх пачастунак.

— У гэтай школе такі добры сямейны дух, — хваліць мясцовую грамаду Альжбета Раманчук.

Настаўніца працуе яшчэ ў школах у Чаромсе і Гарадку дык мае магчымасць паназіраць і параўнаць з іншымі. Калі просім, каб назвала сваё любімае месца, яна без сумнення называе Залукі. У апошнім выпадку не ідзе пра фінансавую справу. Залуцкія настаўнікі, нават тыя дыпламаваныя, працуюць на так званай *падставе*.

— Ёсць за што іх любіць, — кажа Альжбета Раманчук. — Калі Залукі пераходзяць у гімназію ў Гарадку, усе нашы дзеці далей вывучаюць беларускую мову. Гэта наша найбольшая ўзнагарода і гонар.

Ірына Супрун з вучнямі

Школа ў Залуках

* * *

— Каб не добрыя людзі, дык мы самі не далі б рады, — упэўненая Ірына Супрун.

І сёння, каб добра прыняць гімназістаў з Гарадка, настаўнікі падрыхтавалі ім гурбу цукеркаў і ўсякага пячэння. Салодкі стол спансаравала Малгажата Івацэвіч, уласніца крамы з Міхалова. Ідэяй спансорынгу спадарыня Малгажата заразіла сваіх пастаўшчыкоў. Зараз і яны давозяць прадукты ў Залукі.

— Ад пачатку дапамагае нам Багдан Лех, — хваліць мясцовага ўласніка крамы спадарыня дырэктар. — Ён, так сказаць, наша падстава і душа. Ніколі яшчэ не адказаўся ад дапамогі.

Шмат цёплых слоў пачую таксама ў адрас прыватнага прадпрымальніка Яна Маляноўскага з Навасёлак, які на свой кошт завёз усю школу ў Варшаву і гасцяваў іх у сталіцы цэлы тыдзень.

Зараз у Залуках трыццаць вучняў.

— А ў прадшколлі аж 16 дзяцей, — адзначае Ірына Супрун. — Яны найважнейшыя, бо дзякуючы ім школа будзе існаваць. Пакуль за пабыўку ў прадшколлі бацькі не плацяць грошай. Дашкольнікаў частуюць абедамі (кошт аднаго 8 злотых), якія давозяць з рэстарана „Пронар" у Валілах. Абедамі карыстаюцца таксама вучні пачатковай школы. Аж дваццаць асоб фінансуе сацыяльная дапамога.

Энергічная Ірына Супрун пакажа мне ўсе дыдактычныя залы і раскажа пра планы на будучыню. У будынку праведзены грунтоўны рамонт. Залы, асабліва тыя для наймалодшых, зіхацяць цяплом і вясёлымі колерамі. Памянялі вокны і ўпарадкавалі школьны пляц. Зараз вядзецца рамонт памяшканняў, у якіх раней жылі настаўнікі. Калі глядзім з перспектывы другога паверха і бачым плоскі, аблезлы дах, спадарыня дырэктар кажа:

— Мая мара, каб на гэтым даху разбіць прыгожы агарод і ў ім праводзіць урокі або сустрэчы з гасцямі.

* * *

Тое, што здарылася ў Залуках, калі ўлічыць яшчэ нашу неахвоту да змагання, проста неверагоднае. Адукацыйная ўстанова, прысуджаная на ліквідацыю і знішчэнне, памаленьку падымаецца з заняпаду, пабольшыўся ў ёй лік дзяцей. Тут знайшлі працу настаўніцы з распушчаных школ, якія зараз працуюць з падвойнай энергіяй.

— Школа для нас найважнейшая, — кажа Ірына Каранкевіч, старшыня аб'яднання *Залукі над Супраслю*. Ад трох гадоў інсуе яна на даволі цікавым статусе непублічнай школы з правамі школы публічнай.

— Найгоршы быў першы месяц, — кажа старшыня аб'яднання. — Нас усё страшылі санэпідэмстанцыяй, што прыедуць з кураторыі і закрыюць будынак.

Каб ратаваць сітуацыю, бацькі самі ўзяліся за рамонт. Многа дапамаглі ім, як адзначае спадарыня Каранкевіч, добрыя людзі:

— I wie pani, że u nas wszystkie dzieci uczą się języka białoruskiego, — дадае з гонарам.

— А якія ў вас сувязі са школай? — пытаем.

— Я сама выпускніца школы ў Залуках, а зараз у ёй вучацца мае ўнукі.

Спадарыня Ірына Каранкевіч дадае:

— Sama jestem katoliczką, ale śpiewam w naszym zespole *Kalina*. Bo to, co nasze, jest dla nas najważniejsze. Mnie na przykład nie wzruszają tak mocno pieśni krakowskie jak nasze. Bo kiedy śpiewamy nasze białoruskie piosenki, to dusza po prostu się raduje.

Мне таксама было прыемна пасля гадоў наведаць Залукі. У час майго візіту (27 кастрычніка г.г.) школу наведала працаўніца санэпідэмстанцыі. Але яе ўжо не баяліся, наадварот, жанчыну запрасілі на беларускія выступленні, з якімі прыехаў Гарадок.

Мая прапанова Павятовай выбарчай камісіі ў Сямятычах

Набліжаюцца чарговыя выбары. Зноў пачнуцца нараканні на нізкую яўку выбаршчыкаў. І будзе яна штораз ніжэйшая. Людзі старэюць, штораз цяжэй ім хадзіць, а маладыя наогул не маюць г.зв. пачуцця грамадзянскага абавязку. Каб выратаваць большую яўку, можна невялікім коштам зрабіць пэўныя новаўвядзенні, якія — шчыра кажучы — ужо даўно павінны быць зроблены.

Самае галоўнае — стварэнне людзям магчымасці фізічна дабрацца да выбарчага ўчастка. Па нядзелях у вёсках Сямятыцкага павета аўтобусная камунікацыя амаль не працуе. З некаторых вёсак (напрыклад, з Шумілаўкі, Грабаркі) адлегласць да выбарчага ўчастка ў Нурцы складае 10 кіламетраў. Як туды дабрацца інваліду ці старому чалавеку, калі ў яго няма аўтамабіля? Мне самому трэба пераадолець 2 км да ўчастка, але хіба не дабяруся, бо няма ў мяне свайго транспарту. На суседзяў спадзявацца не прыходзіцца, бо многім — гаворачы папросту — да лямпачкі ўся гэтая гульня ў дэмакратыю. Але каго гэта цікавіць? Ці з'явіцца на ўчастку 80% ці 8% выбаршчыкаў, то і так члены выбарчай камісіі возьмуць тыя ж грошы. Навошта тады клапаціцца?

А дастаткова было б у дзень выбараў паслаць у вёскі школьныя аўтобусы. Па адным курсе ў кожную вёску: сабраць ахвотных, пятнаццаць мінут пачакаць перад выбарчым участкам і назад адвезці выбаршчыкаў у вёску. А тыдзень да выбараў пісьмова праінфармаваць солтысаў аб такой магчымасці і абавязаць іх данесці гэтую інфармацыю да кожнага жыхара. Простае, праўда? Трэба толькі хацець, каб урэшце нешта ў гэтай справе зрабіць.

Аргумент аб коштах такога транспарту — абсурдны. Выбары і так каштуюць, а наша краіна — багатая. Калі яна вытрымлівае пастаянны рост ліку чыноўнікаў, вытрымае і гэта.

Што Павятовая выбарчая камісія ў Сямятычах думае наконт маёй прапановы?

Марк ЦЫБАРТ

Сабакі і людзі

У першай праграме тэлебачання выступілі сябры Таварыства аховы звяроў ды заклікалі чыноўнікаў увесці закон аб пакаранні тых людзей, што трымаюць сабак увязаных на ланцугу. Сябры таварыства самі прывязваліся на ланцугі да слупоў у гарадах, каб прадэманстраваць грамадству свой пратэст і паказаць пакуту звяроў. Праўда, у гарадах людзі, якія сабак гадуюць у кватэрах, не трымаюць іх на ланцугах. Па вёсках ці то гаспадар, ці пенсіянер, найчасцей сабаку трымае на ланцугу і ў будзе. Калі сабака ў вёсцы будзе непрывязаны, дык калі ўбачыць гэта паліцыянт і даведаецца, хто з'яўляецца ўласнікам сабакі, дык пакарае гаспадара штрафам. А калі сабака вырвецца з падворка на волю і выбяжыць на вуліцу ці ў лес, дык маюць права яго застрэліць. Дарагія сябры Таварыства аховы звяроў! Калі вашы дзеткі прыедуць да сваіх бабуль і дзядуль у вёску, а сабакі будуць спушчаныя з ланцугоў — то што скажаце тады пра бяспеку малечаў? На бяду многа не тэба. Па-мойму, на такую справу закону няма чаго выдумляць.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

ЦІ ЎПУШЧАНЫ ШАНЦ АТРЫМАЦЬ ГРОШЫ?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Некаторым радным і войту Нараўчанскай гміны шкада фінансавай дапамогі, якую атрымалі б, калі б прагаласавалі за пашырэнне парку

Калі Міністэрства асяроддзя распачало інтэнсіўныя намаганні ў напрамку больш строгай аховы Белавежскай пушчы, можна было разлічваць, што не здасца і ў празуменні з мясцовымі самаўрадамі, або без яго даб'ецца сваёй мэты. Самаўрадаўцы Гайнаўскага павета, якія ананімна каментавалі размовы паміж Міністэрствам асяроддзя і пушчанскімі самаўрадамі, таксама гаварылі, што мясцовыя самаўрады не будуць у змозе спыніць працэсу ўвядзення штораз большай аховы Белавежскай пушчы на тэрыторыі Польшчы (у Рэспубліцы Беларусь уся Белавежская пушча ахоўваецца ў рамках парку), чаго патрабуюць не толькі экалагічныя арганізацыі, але і ўлады Еўрасаюза.

Міністэрства асяроддзя папрасіла пушчанскія самаўрады ў тэрміне да 20 кастрычніка даць адказ наконт прапановы пашырэння Белавежскага парку на 12 тысяч гектараў, з якіх 62% ужо зараз ахоўваюцца ў рамках запаведнікаў. У час вясковых кансультацый, а пасля на сесіях гмінных рад быў адкінуты праект павелічэння БНП на тэрыторыі Нараўчанскай і Гайнаўскай гмін (радныя Гайнаўскай гміны таксама аднагалосна прагаласавалі супраць прапанове павелічэння парку), а Белавежская гміна не правяла ні кансультацый, ні галасавання ў сваёй радзе.

— Мы выказалі максімум добрай волі і запэўнілі самаўрадам рэалізацыю ўсіх іх патрабаванняў. Аднак на гэтым этапе белавежскі працэс закончыўся паразай. Не дойдзе да рэалізацыі самай вялікай экалагічнай праграмы развіцця Белавежскай пушчы. Я лічу, што гэта страта для ўсіх, для жыхароў, для гмін і для нас, якія хацелі ажыццявіць гэты праект. Аднак прырода не можа даўжэй чакаць, — заявіў 21 кастрычніка на спецыяльнай прэс-канферэнцыі міністр асяроддзя Анджэй Крашэўскі.

Сказаў ён, што высечка дрэў будзе ў галоўным адбывацца на менш вартасных участках і будзе абмежаваная да неабходнага забеспячэння мясцовых патрэб — да 48,5 тыс. кубаметраў драўніны ў 2011 годзе. Міністр паведаміў таксама, што ў бліжэйшым часе прадбачваецца ўвесці забарону паляванняў у сумежнай з паркам зоне, але гэтая прапанова будзе яшчэ разглядацца ўрадам і можа ўступіць у сілу найхутчэй прыблізна за месяц. На практыцы высечка драўніны мае быць у тры разы меншай, у параўнанні да цяперашняга максімальнага ліміту высечкі, устаноўленага для Белавежскай пушчы ў Польшчы на тэрыторыі Дзяржаўных лясоў і прыблізна ў два разы меншай ад колькасці драўніны, якая фактычна будзе вывезена ў гэтым годзе з пушчы. Гэтыя аб'ёмы рознай драўніны, паводле Міністэрства асяроддзя, павінны забяспечыць прыватных жыхароў і рамеснікаў Гайнаўскага павета ў апал і сыравіну. Але паяўляюцца ўжо сумненні, якія патрэбы мясцовых рамеснікаў можна будзе забяспечыць. Затое мае быць немагчымай купля драўніны з Белавежскай пушчы на камерцыйныя і прамысловыя патрэбы. Вялікае расчараванне ў мясцовага насельніцтва выклікала таксама інфармацыя, што міністр асяроддзя выступіць у Нацыянальны фонд аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі, каб выдзеліць толькі 6 млн. зл. на фінансаванне індывідуальных інвестыцый у ахову асяроддзя, напрыклад, на будову пры дамах ачышчальняў сцёкаў, ці на салярныя вадагрэйныя ўстаноўкі. У час прэс-канферэнцыі міністра асяроддзя таксама стала вядомым, што ён не здаецца і дыскусію ў справе пашырэння парку не лічыць завершанай, а калі б пушчанскія самаўрады мелі ахвоту адкінуць размовы, Міністэрства асяроддзя мела б быць гатовым пачаць перагаворы.

— Я рады, што міністр асяроддзя хоча яшчэ з намі размаўляць. Маю надзею, што новыя самаўрады, выбраныя ў лістападзе, таксама выявяць такую волю, — сказаў гайнаўскі староста Уладзімір Пятрочук. — Я думаю, што варта было рэалізаваць Белавежскую праграму развіцця, бо гэта была б вялікая фінансавая дапамога гмінам. Шкадую, што амаль 70 млн. зл. прайшло нам пад носам. Час выбарчай кампаніі гэта не найлепшы час на такія рашэнні.

Нараўчанскі войт Мікола Павільч пасля галасавання, у час якога была адкінута прапанова пабольшання парку, не паказваў задавальнення рашэннем радных. Можна было заўважыць, што шкадаваў страчанай фінансавай дапамогі.

— Усяго шкада і грошай таксама. Аднак такая воля людзей, а мы маем дэмакратыю, — заявіў у размове з журналістамі пасля галасавання войт Мікола Павільч, а пасля прэс-канферэнцыі міністра асяроддзя дадаў, што нацэлых 50 тыс. кубаметраў драўніны, прызначаных для высечкі на працягу года, можа не хапіць на патрэбы мясцовых рамеснікаў і насельніцтва, залежна ад спосабу продажы драўніны і яе структуры.

— 6 млн. зл. дапамогі гэта вельмі мала для трох гмін і калі яна пойдзе для індывідуальных жыхароў, не ведаем зараз ці будуць яны дакладваць па 15% сваіх грошай, як гэта мела быць у Белавежскай праграме развіцця, ці па 50% сродкаў, як гэта маецца з еўрасаюзнай дапамогай. Калі б кожны жыхар меў яшчэ індывідуальна выступаць за гэтую дапамогу, можа гэта многіх нашых людзей знеахвоціць змагацца за гэтыя сродкі. Хіба ўсе падрабязнасці наконт прапаноў міністра асяроддзя будуць вядомыя ўжо пасля выбараў, бо зараз нават не ведаем, ці адменяць аўкцыёны па продажы драўніны з пушчы. Затое праблем не павінна ствараць забарона паляванняў у сумежнай з паркам зоне, — сказаў войт Мікола Павільч.

— Калі цяпер толькі для нашай Нараўчанскай гміны ўстаноўлены ліміт высечкі дрэў у пушчы да 60 тыс. кубаметраў, а зараз уводзіцца скарачэнне ажно да 48,5 тыс. кубаметраў на ўсю Белавежскую пушчу, то напэўна будзе замала драўніны для прадпрымальнікаў, а апалу павінна хапіць на 100%. Аднак шкада, што абмяжоўваецца вываз драўніны з пушчы, а столькі паваленых, нават і тоўстых, дрэў гніе і марнуецца ў запаведніках. Людзям, якія не зарыентаваныя ў лясной гаспадарцы, гэта можа і абыякавае, а нам душа баліць, калі глядзім на такую безгаспадарнасць у запаведніках, — заявіў радны з Міклашэва Ян Драўноўскі. — Аднак такой аховы, якая вядзецца ў запаведніках і парку, патрабуюць улады Еўрасаюза і мы не будзем у змозе супрацьстаяць гэтым патрабаванням. Могуць жа ствараць у Дзяржаўных лясах новыя запаведнікі без нашай згоды і яшчэ абмежаваць высечку дрэў напрыклад да 24 тыс. кубаметраў у год і мы нічога не зробім. Добра, што даюць гэтыя 6 млн. зл., але гэтых грошай будзе мала на інвестыцыі. Калі б мы далі згоду на парк і атрымалі каля 20 млн. зл. толькі на Нараўчанскую гміну, тады можна было б многа зрабіць. Аднак мы галасавалі ў Радзе так, як прагаласавалі нашы выбаршчыкі ў час сходаў.

„Крокам у добрым напрамку" назвалі эколагі апошнія рашэнні міністра асяроддзя і працягваюць збіраць подпісы пад праектам новага закону аб нацыянальных парках, на падставе якога нават без згоды самаўрадаў можна было б іх пашыраць нават аднаразова на ўсю пушчу. Аднак пазіцыя міністра асяроддзя і прапановы эколагаў не падабаюцца многім жыхарам Гайнаўскага павета. Спытаў я войта Міколу Павільча, ці магчымым будзе вяртанне пасля выбараў да размоў з Міністэрствам асяроддзя ў справе парку, каб можна было яшчэ атрымаць прапанаваную міністэрствам дапамогу.

— У будучыні больш патрэбная нам будзе дапамога на ўзроўні ўрада, бо патрэбныя нам перш за ўсё сродкі на стварэнне новых месц працы. Калі так важнай з'яўляецца ахова Белавежскай пушчы, павінны знайсціся таксама сродкі на новыя месцы працы, — сказаў войт Мікола Павільч.

Свята Бярначчыны

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

— Дваццаць гадоў таму прыехаў я сюды ўпершыню, на гэтак званы сялянскі адпачынак. Гэта быў 1989 год, — гаворыць Ежы Краўчык. — Вырашыў, што пасля гэтых гадоў хачу штосьці пакінуць па сабе жыхарам вёскі.

У Бярнацкім Мосце спадар Краўчык ужо пару гадоў мае свой панадворак. Першапачаткова быў толькі госцем, турыстам у пушчы.

— Я проста закахаўся ў гэтую зямлю — гаворыць. — Мая сям'я з Кракава і Варшавы. Бацька змагаўся ў Варшаўскім паўстанні. Трапіў у Нямеччыну, але адтуль ужо вырашыў вярнуцца не на поўдзень, а ў сталіцу. Я адкрыў для сябе, побач Варшавы, падляшскія краявіды і сюды пастаянна вяртаюся, гэта ўжо і мой кавалак зямлі.

Новы жыхар Ежы Краўчык хутка ўрос у Нараўчанскую гміну. Вельмі актыўна дзейнічае ў нараўчанскім касцёле св. Яна Хрысціцеля.

Ежы Краўчык (трэці справа) хутка ўрос у Нараўчанскую гміну

— Так, у мяне зараз дзве парафіі — св. Патрыка ў Варшаве і гэтая мясцовая, — адзначае.

Хаця ён па веравызнанні каталік, вырашыў падарыць вёсцы праваслаўны крыж.

* * *

Гісторыя крыжа цягнецца ўжо год. Жыхары вёскі жартуюць, што ў іх свая „справа з крыжам", але ў яе зусім іншае вымярэнне. Ідэя яго ўзнікнення — гэта сімвал узаемаразумення і павагі да суседзяў, а мэта — яднанне. Задума спадара Краўчыка знайшла шмат прыхільнікаў, а першым з іх стаў былы надляснічы Надляснічства Броўск Роберт Тромбка.

— Сам знайшоў дуб, з асігноўкай, заплаціў за яго, усё як трэба, — казаў айцец Леанід Янкоўскі са Старога Ляўкова пасля асвячэння крыжа. — Сказаў, што дзеля такой мэты дуб павінен быць падараваны ад сэрца.

Дуб трапіў у Варшаву, дзе пераўтварыўся ў крыж. Крыж быў усталяваны, але месяцамі чакаў асвячэння. Пасля гэтага перыяду трэба яго было нанава пачысціць, адмаляваць, забяспечыць. Хаця ўся ініцыятыва выйшла ад спадара Краўчыка, але і ўсе астатнія жыхары маюць у ёй свой вялікі ўклад. Сарганізавалі сходку і сабралі грошы на ікону, якая пісалася спецыяльна для гэтага крыжа. Калі ўжо гатовая магла трапіць на месца свайго прызначэння, усе маглі сабрацца і асвяціць крыж.

Хаця апошнія дні былі халодныя, то 24 кастрычніка выйшла сонца, а ртутны слупок тэрмометра паказваў чатырнаццаць градусаў. Можа гэты дзень кожны год будзе такім прыемным і прыхільным, бо жыхары вырашылі назваць яго Святам Бярнацкага Моста.

— Гэта крыху мая віна, што не сустрэліся раней, калі было цяплей, — кажа айцец Леанід. — Доўга тут з усім арганізаваліся.

— Нічога, бацюшка, атрымалася так, так і застанецца, — у адказ прамовілі жыхары, шчаслівыя, што ў натуральны спосаб узнікла свята вёскі.

Пад новым вясковым крыжам сабраліся найстарэйшыя жыхаркі Бярначчыны — Ніна Шаршуновіч, Ніна Харкевіч і Ядвіга Карпюк. Прыйшлі ды прыехалі пастаянныя жыхары і тыя, хто сюды з'яўляецца па выхадных або калі цёплае надвор'е. Прыбылі і госці, якім ідэя крыжа блізкая, сваякі, старшыня Рады Нараўчанскай гміны Андрэй Нядзведзь. Пасля малітвы ля новага крыжа ўсе сустрэліся на ўрачыстым абедзе. Святочны стол падрыхтавалі наймалодшыя гаспадыні (і гаспадары). Хаця ўсё праходзіла на прыродзе, пару гадзін трывала першае ў гісторыі Свята Бярначчыны і ўсе згодна паўтаралі: „Гэты дзень будзе нашым святам!". Былі і словы падзякі. Першым ад'язджаў спадар Краўчык, „варшавяк", як яго да гэтага часу называлі ў вёсцы.

— Вельмі дзякую за магчымасць сустрэцца з вамі ўсімі. Я проста хацеў нешта па сабе пакінуць у гэтай вёсцы, бо лічу, што нашым абавязкам жыць тут у згодзе, паважаць адзін аднаго, дапамагаць сабе ўзаемна. Няхай і гэты крыж будзе сімвалам нашай згоды, узаемаразумення без падзелаў і веры ў шчаслівую будучыню, — сказаў на развітанне ўжо „свой варшавяк".

Падобныя словы несліся праз Бярначчыну ўсю нядзелю. Застаецца спадзявацца, што пажаданні добрага здароўя, якія кіравалі да вернікаў айцы Леанід і Ян, якія адслужылі малебен ля крыжа, здзейсняцца і праз год у падобным крузе будзе магчымасць зноўку сустрэцца. А можа яшчэ і ў пашыраным.

* * *

Яшчэ не так даўно Бярначчына налічвала трынаццаць нумароў. Пад кожным з іх хатка з сямейнай гісторыяй. Прыкра казаць, але зараз некаторыя ўжо ў коме. Надзея толькі ў нашчадках іх уласнікаў, якія могуць вярнуць твары сваіх бацькоў, дзядоў ці прадзедаў у нашую памяць. Аднак для Бярначчыны гісторыя здаецца можа быць больш ласкавай, чым для іншых вёсак, дзе сляды іхных жыхароў запісаны толькі ў рэштках фундаментаў. У Бярначчыне за апошні год узніклі два новыя фундаменты. Іх уласнікі далучыліся да спадара Краўчыка і такім чынам у вёсцы зараз шаснаццаць панадворкаў. Галоўнае, што не прыйшлі сюды і жывуць чужынцамі. Новыя жыхары, так як спадар Краўчык, разумеюць, што вёска гэта адно маленькае грамадства, якое трэба паважаць і часткай якога трэба папросту стаць.

Што сказаць пенсіянерам?

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

У другой палове верасня г.г. мундзірныя службы арганізавалі шэсце ў Варшаве з пляца Пілсудскага пад урад, сядзібу Сейма і канцылярыю прэзідэнта РП у сувязі з замарожаннем і непавялічваннем платы ў 2011 годзе. Крычалі яны, што бедна ім жывецца і ледзь зводзяць канцы з канцамі. А ці маюць яны кепска? Ці галадаюць? Адыходзяць на пенсіі ў маладым узросце, а пасля яшчэ працуюць (часта як целаахоўнікі), а нашы бізнесоўцы прымаюць іх з адкрытымі рукамі, бо не трэба адводзіць на іх страхоўкі...

А што маюць гаварыць пенсіянеры, якіх большая частка атрымлівае пенсіі па 600 ці 700 злотых у месяц? Гэта людзі старэйшага ўзросту і многа грошай прызначаюць на лякарствы ды да таго ж трэба аплаціць кватэру, электраэнергію, тэлевізар, тэлефон, запасціся дрывамі ці вугалем на абаграванне хаты. Прыязджаюць аб'язныя прадуктовыя крамы ў вёску і штодзень тавары даражэйшыя ў іх. Хоць падатак ПДВ павялічыцца ад студзеня 2011 года, ужо цяпер узраслі цэны. На гэта ўсё аніякага ўплыву не маюць наш урад, ані міністр сельскай гаспадаркі Марк Савіцкі, хоць і ён выказваўся ў тэлебачанні, што прадуктовыя тавары не павінны нашмат падаражаць. А ўжо некаторыя даражэйшыя на 30%!

Пенсіянеры не выйдуць страйкаваць, бо ўжо нядужыя. Але калі б выйшлі, то нашы ўлады скажуць, што нічога і так не зробяць — толькі пакрычаць і разыдуцца!..

Польска-беларускія сувязі

14-16 кастрычніка ў Любліне на базе Інстытута славянскай філалогіі і Інстытута гісторыі Універсітэта імя Марыі Кюры-Складоўскай, а таксама Польскага таварыства беларусістаў адбылася чарговая міжнародная навуковая канферэнцыя „Польска-беларускія культурныя, літаратурныя і моўныя сувязі" („Polsko-białoruskie związki kulturowe, literackie i językowe").

На пленарным пасяджэнні выступілі з дакладамі навукоўцы з Польшчы (Ніна Баршчэўская, Рышард Радзік), з Беларусі (Юрый Вашкевіч, Іван Штэйнер) і Германіі (Гун-Брыт Колер). У канферэнцыі прынялі ўдзел гісторыкі, сацыёлагі, рэлігіязнаўцы, этнографы і філолагі з Польшчы, Беларусі, Германіі, Расіі, Славакіі, якія выступілі на трох секцыях: культурнай, літаратуразнаўчай і мовазнаўчай. Пасля работы кожнай з секцый адбываліся ажыўленыя дыскусіі па пытаннях, якія былі закрануты ў дакладах выступоўцаў. Актыўны абмен думкамі і падчас гэтых дыскусій, і ўвогуле падчас работы канферэнцыі, безумоўна, быў карысны для выпрацоўкі новых поглядаў на праблему беларуска-польска-іншаславянскіх сувязей.

Ірына САВІЦКАЯ

„Бюлетэнь Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў", 2010, № 9

Святкавалі настаўнікі

14 кастрычніка г.г. Дзень нацыянальнай адукацыі святкавалі настаўнікі-пенсіянеры з Гайнаўкі. Значкі за 50-гадовую прыналежнасць да Саюза польскіх настаўнікаў (СПН) атрымалі Марыя Зданоўская, Луцыя Вашкевіч, Вольга Анджэюк і Вітальд Лапінскі, а дыплом з нагоды 75 гадавіны нараджэння — Раіса Яроцкая. Уручыла іх старшыня Праўлення аддзела СПН у Гайнаўцы Аліна Пытэль.

Пасля афіцыйнай часткі адбылася мастацкая ў выкананні моладзі Пачатковай школы № 3 у Гайнаўцы пад кіраўніцтвам настаўніцы Іаанны Андрасюк.

На закачэнне святкавання быў абед на 50 чалавек, былі ўспаміны пры келіху віна, пры каве і гарбаце. Усе былі ўдзячны гайнаўскім прадстаўнікам СПН за памяць пра іх.

Ірэна Юрчук — старшыня секцыі настаўнікаў-пенсіянераў у Гайнаўцы паінфармавала пра чарговыя мерапрыемствы ў лістападзе і ў снежні г.г. Бліжэйшай будзе вечарына ўспамінаў пра настаўнікаў, якія адышлі ад нас назаўсёды. На іх магілах настаўнікі-пенсіянеры запаляць знічы ў доказ памяці і глыбокай пашаны.

Па дарозе

Цераз тэрыторыю Нарваўскай гміны пралягае рухлівая ваяводская дарога з Беластока ў Гайнаўку праз Навасады. Па дарозе стаяць аўтобусныя прыпынкі ПКС і на іх пачакальні-дашкі. У Нарваўскай гміне — па ўсім гэта відаць — самаўрадавыя ўлады мала дбаюць пра іх. Там-сям стаяць драўляныя „будкі" з дзіравымі сценкамі, між іншым, у Анцутах. А вось у суседняй Гайнаўскай гміне там яны дагледжаны — прыгожыя, памаляваныя густоўна падабранымі колерамі.

Сёлета адно толькі цешыць. Пры шашы з Трасцянкі ў Нарву ссеклі каля сотні старых таполяў, з якіх падалі долу сухія галіны. Дарожныя службы пачысцілі равы паабапал артэрыі.

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Дзе яшчэ ведаюць *падыходы?*

Шасці-класнікі з настаўніцай Альжбетай Раманчук

— Калі сабраць дзяцей з падставоўкі і гімназіі, — палічыў усіх сяброў шасцікласнік Патрык Літвін, — то будзе нас за трыццаць...

— У самых Залуках?

— Так. А калі наязджаюць дзеці з *пегеэраў*, тады нас яшчэ больш...

— І калі сустрэнецеся, то што тады робіце?

— Гуляем у *падыходы*.

Пачуць такое ад сучаснага дзіцяці, гэта так як вярнуцца ў часы свайго дзяцінства. У *падыходы* гулялі ўсе дзеці сорак гадоў таму, калі не было тэлевізараў і камп'ютараў. Зараз гэтая рухавая і адукацыйная гульня саступіла месца віртуальным змаганням на экранах камп'ютараў. Патрык любіць *падыходы* з-за магчымасці пазнаваць тэрыторыю ў сваёй вёсцы і на загуменні. Дзеці спачатку сустракаюцца каля пажарнага дэпо, там падзяляюцца на групы ды пачынаюць гульню. У *падыходах* адны хаваюцца, а другія іх шукаюць.

— Гэта такая файная гульня, бо можна хавацца на чужых панадворках або далёка за вёскай...

— А як далёка, — пытаем у хлопца, — выбягаеце за сваю вёску?

— Далёка, нейкія трыста метраў...

Каб групы не разгубіліся ў прасторы, тыя, што ўцякаюць, значаць сляды стрэлкамі. І нават тады, калі вядомы напрамак і паваароты, нялёгка знайсці дзяцей. Забава дазваляе добра пазнаць усе куткі і завулкі ў вёсцы ды нават у недалёкім лесе. У такі спосаб мы фізічна звязваемся з кожнай ступенькай сваёй мясціны, думаем пра таямнічыя хованкі, якіх звычайна не відаць з вуліцы. Няма слоў, каб апісаць радасць ад адкрывання новых сховаў.

— У Залуках дзеці і моладзь таксама дзейнічаюць у Шчодры вечар перад Новым годам, — дадае Альжбета Раманчук, настаўніца беларускай мовы. — Яны прыдумваюць усякія фокусы, хаваюць брамкі. Гэтая традыцыя захавалася з даўніх часоў. Проста, самі па сабе сустракаюцца і ідуць *у шкоду*. За жарты ў навагоднюю ноч ніхто не крыўдуе. Наадварот, людзі шчаслівыя, што іх традыцыі жывыя...

Нас уразіла таксама жывое зацікаўленне беларускімі песнямі. Аказваецца, усе шасцікласнікі ведаюць Радыё Рацыя і „Падляшскі канцэрт пажаданняў". Мы, зразумела, намаўлялі нашых сяброў чытаць „Зорку" і беларускія кніжкі, каб пасля яны маглі пазваніць у сваё любімае радыё і прыгожанька па-беларуску заказаць віншаванні для сваіх бацькоў, сяброў ці каханых.

ЗОРКА

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны Кандрацюк

1. Імя і прозвішча: **Кася Мінчук** (ПШ у Залуках, II клас)

2. Твой любімы прадмет: беларуская мова.

3. У жыцці хачу стаць: настаўніцай беларускай мовы.

4. У сяброў цаню: шчырасць і дабрыню.

5. Не люблю: калі хто мяне зачапляе і дакучае.

6. Па-беларуску размаўляю: з бабуляй і на ўроках беларускай мовы.

7. Кніжка, якая Цябе захапіла: «Чаму» — гэта даведнік, у якім можна напрыклад даведацца, чаму ў раслін зялёны колер.

8. Падабаецца Табе музыка: песні калектыву «Калінка», у якім спявае мая сястра Аня.

9. Твае ўлюбёныя стравы: рыба і адбіўныя катлеткі (*схабовыя*).

10. Твой любімы спосаб адпачынку: Люблю адпачываць над вадой. Асабліва над рэчкай Супраслю, якая плыве за маёй стадолай.

11. Калі дарасту, хачу жыць: у Залуках, тут мае карані, сям'я і сябры.

Стралец Коба і шчасце

(японская казка)

Гэта здарылася даўным-даўно, а некаторыя кажуць, што яшчэ даўней. На востраве Хонсю ў хатцы аколенай гарамі жыў паляўнічы Коба. Аднойчы сышоў ён у даліну, каб упаляваць нейкую дзікую жывёлу. З самага ранку яму не шанцавала. Ды яшчэ, як на злосць, пайшоў дождж. Стралец схаваўся ў шалаш і думаў пра сваю няўдачу. Ля яго вясёла прагульваўся дажджавы чарвяк, які пачуў дождж і выпаўз з зямлі. Коба паглядзеў са спагадай на жывінку:

— Ты зямны чарвяк, — пажартаваў паляўнічы, — і я зямны чарвяк. Сумна, браток без уда.....

Ён не паспеў дакончыць слова як з травы выскачыла жаба і праглынула дажджавога чарвяка. Коба пашкадаваў жывёлінку. Спачатку ён не звярнуў увагі, калі ля ягонага пляча абарвалася галлё. Тое галлё папраўдзе не было галінай, толькі вужакай, якая *ажыла* на зямлі, падпаўзла да жабы і праглынула яе.

www.babble.com/CS/blogs/famecrawler/2007/11

— Яшчэ гэтага не хапала, — крыкнуў Коба. — Вон з маёй хаты, паскуды!

Ён выйшаў на двор, а следам выпаўз абражаны вуж. Гадзюка лягла на зямлю і думала, каб штосьці яшчэ з'есці. Раптам залопалі крылы і згары наляцеў фазан. Ён ухапіў вужа і паляцеў з ім у сваё гняздо. Коба пабег іх следам. Ён прадчуваў, што гэтая гісторыя хутка не скончыцца. Праўда, фазан мала нацешыўся сваёй здабычай, бо яго ўпалявала рысь. Рысь завалакла фазана ў карчы, перакусіла яму глотку і пачала дзерці каляровыя пёры.

— Ну, дык даскакаўся, гультай! — крыкнуў Коба.

І тут неадкуль з'явіўся мядзведзь. Ён задушыў рысь і завалок яе ў бярлогу ды разам з мядзведзянятамі пачалі лупіць шкуру і есці мяса. Тады Коба дастаў стрэльбу і пацэліў у іх. Мядзведзі настолькі былі заняты ядой, што нават не прыкмецілі чалавека са стрэльбай.

„Яшчэ ніколі я не меў такога дурнога шчасця, — падумаў Коба, — каб упаляваць аднаразова трох мядзведзяў. Не можа быць такога! Гэта падман, такога не трэба. Я ж добра бачыў, як дажджавы чарвяк, жаба, вуж, фазан, рысь апынуліся ў адных лютых лапах. Раней усе яны ўсіх паелі, каб пасля іх саміх хтось з'еў. І я тут відаць апынуўся невыпадкова?" — стралец прыгадаў свайго *брата* дажджавога чарвяка.

Ён зразумеў, што гібель мядзвежай сям'і не прынясе яму шчасця. Наадварот, калі чалавек бачыць як усе ўсіх дзяруць і з'ядаюць, ён павінен спыніцца. Падумаць, куды ідзе яго дарога...

Коба павесіў стрэльбу на плячо і вярнуўся ў свае горы.

ЗОРКА

Фільмавыя імёны і свае фільмы

За першай партай Рафал Здановіч і Матэвуш Карпюк

Кожны чацвёрты хлопец у класе — Матэвуш. Сярод сяброў сустрэнем яшчэ трох Каміляў, дзве Караліны і дзве Патрыцыі, па двух Грышкаў ды Якубаў, ёсць і Эстэра ды Марлена... Такі арыгінальны вянок імёнаў у чацвёртым класе. Сустракаемся на ўроку беларускай мовы ў Орлі. Нашы сябры з захапленнем распавядаюць пра беларускія фільмы, якія глядзяць на ўроках. Ну, фільмы не зусім беларускія, яны толькі дубляваныя па-беларуску. Цікава калі на беларускай мове размаўляе іх індзейская любіміца Пакахонтас ці рускія жулікі Воўк і Заяц. А можа не цікава, толькі проста звыкліся мы, што ўсё, што ідзе са шклянога экрана тэлевізара павінна гучаць па-польску. Нашы сябры часам размаўляць *па-свойму*, значыць, на мове бацькоў, дзядоў і жыхароў вёскі. Гэта падказвае ім, што кожная мова добрая для гутаркі і фільмаў. А фільмы добрыя для адпачынку, бо ў чацвёртым класе дзеці аж з дзесяці вёсак. Найдалей у школу мае Караліна, яна даязджае аж з Вулькі-Выганоўскай.

— Каб паспець на школьны аўтобус я прачынаюся а палове шостай раніцы, — кажа дзяўчынка, — а палове сёмай выходжу на прыпынак і чакаю калі прыедзе і забярэ мяне „гімбус".

— А ці хочацца пасля спаць на ўроках?

— Не, бо ў класе многа вясёлых сяброў!

Сапраўды, настрой у класе падымаюць хлопцы-жартаўнікі.

— У нашым класе трынаццаць хлопцаў і адзінаццаць дзяўчын, — кажа Рафал Здановіч.

Гэта ён звярнуў увагу на імёны класных сяброў. Яны ў сваю чаргу папрасілі ў Рафала, каб ён заспяваў для „Зоркі" (дзеці добра ведаюць нашу газету). Хлопец ахвотна запрэзентаваў свой шэдэўр, якія спявае разам са школьным калектывам „Арлянскія званочкі". Нас прыемна здзівіла, што дзеці гэтага класа любяць чытаць кніжкі. Магчыма, у будучыні яны самі будуць здымаць беларускія фільмы і пісаць кніжкі. У школе дзейнічае фільмавы гурток, які здымае фільмы і паказвае жыццё ды традыцыі нашых вёсак, а іх героі часта размаўляюць *па-свойму*.

ЗОРКА

Верныя Міры ЛУКШЫ

Фелікс

Феліксам завуць ката.
Вусы — проста любата.
Як мятла — пушысты ворс.
Дыбам ставіць — які ж форс!
Феля любіць у нядзелю
на акне пушыць кудзелю,
каб уся публіка пад дом
сабралася пад акном:
Фелька гожы, Фелька вельки!
А якія лапы ў Фельки!
Прыйдуць кошкі... Прыйдуць людзі.
На ўсю вёску слава будзе,
і па гміне, па павеце!
Здымкі пусцяць у інтэрнэце!..
Слава славай, а каўбаскі
Фелю прынесці — не ласка?
Фелікс ежу ўпляце...
І яшчэ больш падрасце!

Музыка з кайфам

Дударскі бард, бардаўскі дудар

Калі на сцэну фестывалю „Бардаўская восень" выходзіць чарговы ўдзельнік конкурсу, для гледачоў з'яўляецца ён таямніцай. Паколькі некаторым сябрам журы фестывалю канкурсанты бываюць вядомыя, хаця б з-за адборачнага канцэрта, то ўжо публіка з маладымі бардамі нагул сустракаецца ўпершыню. Бардзмагар мае тады некалькі хвілін, каб пераканаць да сябе публіку і журы, паказаць сябе як найлепш. Калі вярнуцца да сёлетняй „Бардаўскай восені", то самыя энергетычныя апладысменты атрымаў, здаецца, праект „Інфра-чырвоны выдых". І хаця апынуўся ён у ліку ўзнагароджаных, але гэта Яўген Барышнікаў стаў лаўрэатам Гран-пры.

Яўген Барышнікаў нарадзіўся ў Слоніме, дзе і сёння жывуць яго бацькі. Сам часта наведвае родныя месцы, якія натхняюць яго ў творчай працы. Доказам гэтаму — песня пра раку Шчару, нашы беларускія вытокі і карані, якую прэзентаваў у конкурснай частцы „Бардаўскай восені". На гэты фестываль збіраўся тройчы. Неяк кожны год не атрымлівалася: або конкурсу не было, або самога Яўгена. Хочацца сказаць, што лёс яму прынёс самы лепшы момант, калі быў стопрацэнтна падрыхтаваны да сустрэчы з бельскай публікай і незвычайным фестывалем. Яўген Барышнікаў, хаця захапіў усіх сваімі песнямі і гітарным майстэрствам (над якім працуе ўжо 11 гадоў), сапраўды закаханы перш за ўсё ў беларускі народны інструмент. Пра дуду ведае сапраўды многа — пра яе гісторыю, пра сучаснасць. Ведае як і з чаго майстры выконваюць самыя лепшыя дуды і як прасіць дуду пра самы лепшы гук. Хаця яго прыгода з дудой налічвае толькі пару гадоў, гэты незвычайны інструмент паспяхова напаўняе яго прастору зацікаўлення беларускім фолькам. Як дудар, бубнач, гітарыст выступае з рознымі праектамі, а калі выступ адбываецца ў рамках конкурсу ці фестывалю, найчасцей, так як у Бельску, вяртаецца з узнагародамі.

Яўген Барышнікаў прыехаў у Бельск-Падляшскі са спадзяваннем на перамогу. Пераможцам выехаў. Як сам сказаў яшчэ да фестывалю, гэтая перамога, мабыць, дазволіць яму запісаць свой поўны, дэбютны альбом. І гэтага яму жадаем.

i_basovka@o2.pl

Фота Ілоны КАРПЮК

Польска-беларуская крыжаванка № 45

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 41:

Нюх, мацак, канава, малюнак, музыка, каша, но, нос. Ноч, мука, каза, малыш, манюка, цана, сава, но, кактус.

Узнагароду, фламастэры, выйграў **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



АБ'ЯВЫ

XVII Асеннія сустрэчы з беларускім фальклорам

7 лістапада 2010 г. у 13 гадзіну ў вясковай святліцы ў Чыжах пачнецца прэвентыўнае і фальклорнае свята. Выступяць м.інш. „Рэха пушчы" з Гайнаўкі, „Арт-Пронар" з Нарвы, „Жэмэрва" са Студзівод, „Вэрвочкі" і „Арляне" з Орлі, „Зараначка" і „Рамонка" з Ласінкі, „Незабудкі" з Курашава, „Збучанкі" са Збуча, „Чыжавяне".

Латвія ў Салоне

Ваяводскі асяродак анімацыі культуры („Сподкі", Беласток, вул. св. Роха, 14)

запрашае
8 лістапада 2010 г., на 17 гадзіну

на Еўрапейскі мастацкі салон, прысвечаны культуры Латвіі п.з. „Падарожжа ў Рыгу... і не толькі".

У праграме: турыстычныя цікавінкі, прэзентацыі — вершы, сучасная і фальклорная музыка ды танцы, выстава мастацкіх прац.

Дзяды ў Крынках і Гарадку

Згуртаванне „Terra Incognita" разам з Фондам „Villa Sokrates" у партнёрстве з Гмінным цэнтрам культуры ў Гарадку і Публічнай бібліятэкай у Крынках

запрашаюць на Дзяды.

У праграме м.інш. прэзентацыя Гражыны Харытанюк пра абрад Дзядоў і даклад Міры Лукшы пра Ларысу Геніюш.

Крынкі: 16 лістапада, 17:00, у Публічнай бібліятэцы ў Крынках.

Гарадок: 26 лістапада, 17:00, у Гмінным цэнтры культуры.

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт
Універсітэта ў Беластоку

запрашае на

Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

праф. Івона Гофман
„Першая адслона асабістага архіва Ежы Гедройца".

4 лістапада, пачатак у 17.00,
вул. Лінярскага 3, зала 1Б

Фота Міры ЛУКШЫ

Зараз адчуваю сябе свабодным

*Інтэрв'ю з **Анатолем Парэмбскім** — беларускім народным паэтам з Валілаў-Станцыі,*

(ч. 3)

— Калі Вы пачалі друкавацца ў „Ніве"?

— Магу сказаць так, што я некалькі твораў выслаў у „Новую дарогу", яшчэ ў час нямецкай акупацыі, але ніводзін не быў надрукаваны. Пасля вайны, у 1945-1949 гадах я амаль нічога не напісаў. Гэта былі найбольш трагічныя гады. Тады на Беласточчыне дзейнічалі псеўдапаўстанчыя польскія мілітарныя групоўкі, якія я называю бандамі. У нас у 1949 годзе было замардаваных імі двух людзей. Я ўжо стаў пісаць з 1956 года, калі паўстала „Ніва". Там некалькі маіх твораў друкавалася. У „Ніву" я пісаў нерэгулярна. Я заўсёды меў свой погляд на жыццё. Мяне не цікавіла гэта каб камусьці служыць верна.

— Вы ў сваім першым зборніку ўсхваляеце глыбокую душу беларускага народа....

— Паглядзіце, якая гэта цікавая з'ява, што калі хто жывы ды здаровы пачуе беларускую песню, то ідзе яе паслухаць. І так дзеецца на фэстах, канцэртах ці Купаллі. Збіраецца тады многа людзей, бо песня глыбока западае ў сэрца і душу. І гэта свайго роду феномен. Гэта ж усё стварыў просты беларускі народ, правільна адлюстраваў і пераказаў свае пачуцці і гэтым трэба цешыцца. У народныя песні ўкладзена чыстая славянская душа беларускага народа. Якая ж яна адкрытая, якая простая і якая шчырая. Таму гэта ўсім людзям падабаецца. У беларускай песні няма ніякага фальшу і таму да беларускай культуры хіляцца.

Я проста хачу выказаць тое, што не толькі я, але ўвесь наш народ думае і ведае. Мяне вельмі цешыць, што я магу пераказаць, што наш народ думаў, што ведае і гэтае крышку відаць у маёй творчасці. Як такія людзі як я не перакажуць, то ўжо маладыя будуць мала ведаць. Калісьці то на лаўках адзін другому пераказваў. А зараз, калі беларускай вёскі амаль няма, то хто перакажа? Тыя людзі, што аселі ў беластоцкіх клетках — як я называю — не маюць магчымасці спатыкацца паміж сабою. Калі б узяць тыя 1960-1970-я гады, то хто там пра беларускую культуру гаварыў? Не было магчымасці.

— А ці вёска была апорай беларускага народа?

— Такой была беларуская вёска. У гарадах заўсёды ішла або паланізацыя, або русіфікацыя. Чалавек свайго павінен трымацца, дзе б не жыў. Я заўсёды пісаў, што варта быць сабою. Хоць пражыў столькі гадоў, ніколі не саромеўся сваёй беларускасці. Стаў запісваць у вершах усё, што перажыў. Тэма беларускай свядомасці моцна адбіваецца ў маёй творчасці. Жыццё мяне навучыла думаць па-свойму. Сёння ніхто не скажа, што я не ўмею думаць. За сярэбранікі нікому не прадаўся і не думаю гэтага зрабіць.

— Спадар Анатоль, нядаўна быў я на Гарадзеншчыне, дзе ў Гудзевічах знаходзіцца літаратурна-краязнаўчы музей, у якім адзін куточак прысвечаны гарадоцкаму паэту Сцяпану Пятэльскаму, які ў беларускай літаратуры вядомы пад псеўданімам М. Арол. Пасля 75 гадоў ад яго смерці з'явіўся ў друку зборнічак яго паэзіі. Ці Вам вядомая асоба Сцяпана Пятэльскага? Як яго ўспамінаеце?

— Пра Пятэльскага ў Гарадку гавораць толькі выключна добрыя словы. Я ведаю цэлы род Пятэльскіх. Сям'я яго і да гэтай пары жыве ў Гарадку. Часам чую пра яго вершы. Адзін з вершаў як песню прысвоіў наш гарадоцкі хор „Асенні ліст". Тут пра Пятэльскага ведаюць усе гарадоцкія людзі. Думаю, што гэта быў сапраўды шчыры чалавек. Шкада, што ў Гарадку замала пра яго асобу гаворыцца. Такому чалавеку трэба паставіць помнік. Нашыя самаўрадавыя ўлады не дбаюць пра гэта, каб расславіць асобу нашага паэта. Гэты чалавек, які ўпамінаецца ў гісторыі беларускай літаратуры, шмат зрабіў для Гарадка. Варта ўшанаваць яго памяць, хоць бы ўстанавіць мемарыяльную дошку.

— Апрача Вашага літаратурнага плёну Вы шмат у жыцці дасягнулі. Вы маеце сярэднюю тэхнічную адукацыю. У мінулым мала хто з сялян меў сярэднюю адукацыю. Вы былі начальнікам калгаса. Як Вы ўспамінаеце свае гады дарослага жыцця?

— Пачатковую школу я закончыў у 1960-х гадах, калі я ўжо быў жанаты. Перад вайною не было магчымасці закончыць школы. У 1970 годзе я закончыў Сельскагаспадарчае тэхнічнае вучылішча. Пасля гэтага я працаваў у сельскагаспадарчых арганізацыях. Усім работнікам тады жылося вельмі добра. Тады някепска зараблялі і праца была на месцы, на вёсцы. Такога жыцця вёска ніколі не дачакаецца. Перад ваенным становішчам (1980 год) было відаць, што гэтая ўлада заламліваецца. Чаму? Таму, што да гэтай камуністычнай партыі налезла шмат смецця, якое разбурыла партыю знутры. Паўстала новая ўлада. Сённяшняя эканамічная сістэма намнога лепшая ад камуністычнай. Затое чорнарабочага зрабілі нулём. Ён не мае права выказаць сваю крыўду, заробкі ў яго вельмі слабыя. Палякі пры камуне крышку пажылі. Гэта былі лепшыя і горшыя часы. Сёння той, хто ўмее грош загарнуць, таму добра жывецца.

— Чытаючы Ваш апошні зборнік бачу, што Вы з неспакоем глядзіце на сучасны час. Вы вельмі часта апісваеце сучасную рэчаіснасць. Якую Вы бачыце будучыню маладому пакаленню беларусаў?

— Маем беларускія школы, але іх замала. Цэлае шчасце, што аддалі нам Супрасльскі манастыр. Мусілі штосьці зрабіць, бо інакш не выпадала. Толькі я бачу, што сёння фармуецца праваслаўны паляк, у выніку чаго загіне мова, а з часам і праваслаўная вера. Гэтая моцная тэндэнцыя на паланізацыю ідзе з кожнага боку. Беларусы ў Польшчы не маюць ніякай добрай перспектывы.

— У сваіх вершах часта пішаце пра Беларусь, якая мела сваю гісторыю пад прыгнётам усходняй або заходняй улады. А як бачыце сучаснасць Беларусі як дзяржавы?

— У апошнім часе наглядаецца моцны ціск на Беларусь, каб яе прыцягнуць да Захаду. Калі Беларусь далучыцца да Захаду, то будуць там моцныя польскія ўплывы. Ці Беларусь здолее адстаяць сама сябе? Я не падтрымліваю Лукашэнкі, бо ён у пэўных момантах робіць вялікія глупствы. Беларусь як краіна надалей існаваць будзе, бо яна даўно ўжо паўстала. Пад уплывам чыімсьці яна будзе, бо зараз няма краін, каб не былі пад нейкім уплывам — эканамічным ці культурным. Найлепш было б, каб яна не трапіла пад ніякі ўплыў.

— Вельмі дзякую Вам за размову.

— Я таксама дзякую. Мне было вельмі прыемна паразмаўляць з Табою.

Гутарыў Юрка БУЙНЮК

Ад пастушка да рахункавода

Расказ Дзям'яна СВЕНТАХОЎСКАГА, народжанага ў 1931 годзе ў Зубаве.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Пры санацыі ў школу я не хадзіў, а чаму — не ведаю, не было тады школьнага абавязку. З васьмі гадоў стаў пасвіць кароў. З равеснікамі гулялі мы тады ў лапту, па садках за яблыкамі лазілі. Ну, і нас адзінаццаць хлопцаў было з гэтага канца вёскі, то мы, бывала, збіраліся і біліся з хлапечай кампаніяй з другога канца Зубава. Бо тады нас было шмат, што хата то двое-трое дзяцей было, а то і па пяцёра здаралася. І ў нашай сям'і было пяцёра дзяцей, мама з татам ды дзед з бабаю — разам дзевяцёра ў хаце!

Ежу варыла баба, увесь час, дакуль здароўе для гэтага мела; і загадвала ўсімі справамі. Есці ў нас было што, бо гаспадарка вялікая ў дзеда была — дваццаць шэсць гектараў. Да таго ж яшчэ дзед і кавалём быў, кароў у нас многа было, масла сваё білі. І баба шыла таксама мне вопратку, усё рукамі з саматканага матэрыялу: сарочкі, нагавіцы. Тады на вёсцы таксама шмат краўчых было, шылі яны рукамі ў два швы; людзі гаварылі, што між тыя швы вошы хаваюцца. Помню, што абуваўся я ў дзеравякі, зімою ў валёнках хадзіў, а з вясны да восені басанож бегаў, на восені абуваў гумавыя чобаты. Але людзі то і ў холад басанож хадзілі, напрыклад, за грыбамі. Адна баба казала: іду-іду, пасікаю, стану на тое месца, ногі пагрэю і далей у лес.

Як пасля санацыі прыйшлі да нас саветы, то ім у нашай вёсцы брам не стаўлялі. Стаў я хадзіць у школу, вучыў у ёй рускі настаўнік Сяльцоў. У Зубаве арганізавалі калгас, прадсядацелем стаў тутэйшы чалавек, ранейшы камуністычны падпольнік. Але не ўсе туды запісаліся: пайшлі ў калгас толькі малазямельныя беднякі і вельмі багатыя сяляне — гэтыя апошнія ўцякалі ў калгас ад вялікіх падаткаў. І мой дзед у калгас запісаўся, бо кулак. Аднак у нашай вёсцы зямлі ад багатых не забіралі, а вось у Суботцы, ад Гендзеля, забралі. У калгасе рабілі ў полі коньмі, цэлы дзень, а ноччу выводзілі коней на пашу. Кожны абрабляў сваё поле. І людзі паміж сабою не сварыліся, бо баяліся. Бо калі людзі крыху на вуліцы пастаялі, то зараз іх выклікалі ў НКВД і дапытвалі, чаго стаялі, пра што гаварылі.

Як першы нямецкі снарад упаў на Бельск, то нас гэта зацікавіла. Я з сябрам узабраліся на стадолу, каб пабачыць выбух. Але калі ўзарваўся другі снарад, то мы ўжо з той стадолы не злазілі, толькі мігам ссунуліся. Пазней немцы з'явіліся і ў Зубава — ішлі яны па двух баках вуліцы ўздоўж астраколаў. І пра рускіх салдат пыталі, але ў вёсцы іх не было. Злавілі чатырох байцоў у жыце і на пяскоўні каля Зубава расстралялі. Траіх байцоў было мясцовых, з Дубяжына, а адзін быў чужы. Мо два тыдні мінула, як іх раскапалі і дубяжынскія сем'і забралі на свае могілкі. А той чужы астаўся, была над ім нейкі час магілка з крыжам, але пасля ўсё знікла і след нават на тым месцы не астаўся.

Пры немцах я таксама крыху хадзіў у школу, але нядоўга, бо вучылі нямецкай мове і мне не захацелася яе вывучаць. Вучыла настаўніца, хіба з Градалёў яна была; куды дзеўся ранейшы настаўнік Сяльцоў — невядома. Багацейшыя бацькі куплялі дзецям сшыткі, а бяднейшаму бацька нямецкую афішу зрываў і сшываў — на чыстым адвароце можна было пісаць. Здаецца, што школа была праз усю нямецкую акупацыю, вучылі па-беларуску, кніжак мала было.

У 1943 годзе памерла мая мама, хіба ад вадзянога рака; была яна родам з Лушчоў. Бачыў я, як мама ўмірала. Папухлі ёй ногі, не магла іх на ложак залажыць, папрасіла тату, каб памог. Тата залажыў яе ногі, яна можа яшчэ два разы дыхнула, і памерла. Мяне тады моцна ў душы закалола. І яшчэ закалола другі раз, тры гады пазней, калі тата ўзяў другую жонку, з Локніцы. Прывезлі яе вечарам, нехта сказаў мне назваць яе мамай. Я назваў, але гэта мяне вельмі забалела. Але пасля прывык, бо мачаха аказалася добрай жанчынай. Яна раней была замужам, у Катлах, той муж быў дрэнным чалавекам і яна развялася з ім.

З нашай сям'і ў Германію нікога не ўзялі, бо замаладыя мы былі. Сястра, найстарэйшая з нас, была з 1929 года. Хто не хацеў у Германію, той мог тут аставацца, у гаспадара. Гэтак у нас праз усю вайну была прапісана і маміна сястра з Лушчоў. Два хлопцы з Зубава працавалі ў Бельску, аранжад рабілі.

У Германіі адна суседка за галандца замуж выйшла і ў Галандыі асталася. Іншы хлапец з нашай вёскі трапіў у Амерыку. Яго вызвалілі з захаду і ён не хацеў вяртацца дадому, бо тут з бацькам не ладзіўся. Недзе каля 1950 года прыслаў ён ліст дадому. Пісьманосец укінуў той ліст праз аконную фортачку і ён у вазон упаў. А ягоная маці ўсё да варожак хадзіла, пра сына пытала, а яны ўсё гаварылі, што жывы. А апошні раз сказала варожка, што вестка ў хаце. І мо праз месяц знайшлі тое пісьмо ў вазоне. Бацька адпісаў сыну, прызнаўся, што ён у калгасе, і пасля гэтага адказу ад сына больш не было. Аднак пазней у Амерыцы іншы наш вясковец знайшоў яго і сустрэўся з ім.

У наваколлі партызаны хадзілі, пераважна гэта нашы былі, з Кожына, адна баба са Ступнік. У Суботцы яны мост спалілі, але і чобаты ў людзей забіралі, і кажухі, і паршука... Але як прыйшлі партызаны з Белавежскай пушчы, то яны з гэтымі нашымі навялі парадак.

Зубава не высялялі з хутароў, а хутары з Плёскаў і Кнаразоў перасялілі ў вёскі. З Кожына і Ступнік усіх перасялілі пад Зубава, край дарогі, што ў Піліпкі; гэты прысёлак назвалі Новым Зубавам. Але перасяленцы ўсяго не забіралі, пакідалі на сваіх месцах хлявы і клуні, а нават хаты. Перавозілі сюды шпіхеры, устаўлялі ў іх печку, акно, а некаторыя то і зусім не перабіраліся.

У час акупацыі войска нямецкага ў нас не было, але калі набліжаўся фронт, то з'явілася іх шмат. Усе вяскоўцы тады ў поле паўцякалі, пакапалі там бункеры і ў іх сядзелі. Немцы бралі нашых акопы каля Піліпкаў капаць, на адзін дзень; хадзілі немцы па полі і з бункераў людзей назначалі.

У Зубава наехала многа нямецкай тэхнікі, амаль на кожным панадворку нейкая машына стаяла. Фронт тут спыніўся мо на тыдзень: у Піліпках была першая нямецкая лінія, а другая ў нас. На нашым панадворку танк нямецкі стаяў, выязджаў адсюль пад Піліпкі, крыху страляў. І ў лесе пад Кожынам чатыры нямецкія танкі стаялі, і за Зубавам, за ўзгоркам ад Кнаразоў, чатыры нямецкія гарматы стаялі; саветы былі ў Трашчотках і Ляшчынах.

(працяг будзе)

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

УВАГА КОНКУРС

XIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, набраныя на камп'ютары або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XIII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **15 лістапада 2010 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2010 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Конкурс праводзіцца дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

Наце гадоў дваццаць

Вершы Віктара ШВЕДА

Доня імкнулася няспынна,
Каб быць дарослаю дзяўчынай.
Сказала цвёрда: па матуры
Я выбрала архітэктуру.

І нарадзіўся тут варунак:
Здаць матэматыку, рысунак.
І з гэтым справілася Доня,
Яна студэнткаю ўжо сёння.

А вынікаў няма без мукі,
Прад Ёю пяць гадоў навукі,
Каб атрымалася з эфектам,
Магла сказаць: я – архітэктар!

І гэтага ў гадочкаў дваццаць
Жадаюць Доні бацька, маці.
Няхай у Нараджэння Свята
Здзяйсняюцца ўсе мары Наты!

15 верасня 2010 года

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Аляксандр Ласмінскі і Аляксандр Карачун

Мір у Цэнтры

„Мірскі замак, крыніца натхнення" — фотавыстаўка, адкрытая 18 кастрычніка г.г. у Культурным цэнтры Беларусі пры Пасольстве РБ у Беластоку па вуліцы Модлінскай, 2. Фотавыставу прывёз вядомы і ў Польшчы старшыня фотаклуба „Гродна" дакументаліст і фатограф, дырэктар Тэлерадыёкампаніі Гродна, дэпутат Гарадской рады Аляксандр Ласмінскі, і сабрала яна сярод гледачоў выдатных фотамастакоў Беласточчыны, м.інш. Марка Далецкага і Віктара Волкава, якія з Гроднам супрацоўнічаюць ужо больш за трыццаць гадоў. У гэты ж час у Гродне працягвае працаваць выстава падляшскіх фотамастакоў.

Замак у Міры — 100 км ад Мінска, 30 км ад Нясвіжа, у Гродзенскай вобласці, пабудаваны ў XVI-XVII стагоддзях, на месцы драўлянай сядзібы. Збудаваны ён з цэглы і каменя, канчаткова перабудаваны як рэнесансны. Да 1568 г. замкам валодалі князі Ілінічы, потым Радзівілы (да 1828 г.), Вітгенштэйны (да 1891), Святаполк-Мірскія (да 1939). Мірскі замак захаваўся ў адосна добрым стане (у параўнанні з іншымі ў Беларусі) да XXI стагоддзя. Зараз завяршаюцца работы па яго рэканструкцыі. У 2000 г. мірскі замак уключаны ЮНЕСКА ў Спіс Сусветнай спадчыны. Замак пабудаваны на квадратным плане, з чырвонай цэглы, з белымі ўстаўкамі, праёмамі і арнаментальнымі паясамі, з вежамі па кутах вышынёй каля 25 метраў. Заходняя (пятая) вежа з'яўляецца варотнай, мела калісьці яна пад'ёмны мост праз шырокую фосу. Таўшчыня сцен дасягала 3 метраў пры вышыні каля 13 метраў. Два шэрагі байніц кругом замка баранілі доступу, пасля некаторыя байніцы былі заменены вокнамі. Існуюць шырокія падзямеллі замка, якія перасягаюць плошчу наземнай часткі. Замак у Міры больш за 15 год праходзіць буйнамаштабную рэканструкцыю.

— Выстава, якая сёлета адкрылася ў Беластоку, — адзначае Аляксандр Ласмінскі, — аб'язная: яна была ўжо ў Літве, у Маскве. Яна жыве сваім жыццём. А мае калегі і я ўжо зрабілі шмат новых цікавых здымкаў, якія можа ўвойдуць у новую калекцыю. Натхненнем для гэтай выставы і твораў з'яўляецца і Міхаіл Фінберг са славутага аркестра. У 2007 годзе я стаў саўдзельнікам яго свята ля муроў Мірскага замка. З таго часу пачаўся фестываль ля замкавых муроў — ён так і называецца: „Мірскі замак". Радзівілы былі не толькі магнатамі, уладальнікамі. Мелі тэатр, бібліятэку, збіралі каштоўнасці, былі мецэнатамі, самі былі таксама і артыстамі. Напрыклад, Мацей Радзівіл быў выдатным кампазітарам, Урсула Радзівіл — пісала драмы і лірыку. З твораў выдатных Радзівілаў быў прадстаўлены канцэрт, які праходзіў побач замка. На здымках з цыкла „Мірскі замак, крыніца натхнення" — рэфлексіі, эмоцыі і ўражанні, якія мы і мае маладыя калегі-фотамастакі мелі ад кантакту з шэдэўрам беларускага дойлідства. Мы хочам паказаць кавалачак нашай Беларусі, якому пару стагоддзяў, кавалачак тае прыгажосці, якую мы маем, якую захоўваем, якая з'яўляецца гонарам нашай краіны і народа.

Дырэктар Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы Аляксандр Карачун адзначыў, што гэта ўжо пятая за два гады выстава гродзенскіх фотамастакоў у Беластоку і традыцыі ўзаемных візітаў плануюць падоўжыць.

— Наш культурны цэнтр з самага пачатку планаваў рабіць такія выставы, якія на прыгранічча былі б паросту цікавыя для жыхароў Польшчы, калі з Гродзеншчыны прывозіш такую выставу, і каб выклікалі цікаўнасць у гродзенцаў да твораў фотамайстроў з Беласточчыны.

На адкрыцці фотавыставы пабываў і новы генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Аляксандр Берабеня, а таксама студэнты аддзялення беларускай філалогіі Беластоцкага ўніверсітэта, выкладчыкі ўніверсітэта, прадстаўнікі беларускай грамады розных пакаленняў.

Адметнасцю лукашэнкаўскага праўлення ў Беларусі з'яўляецца пастаяннае рэфармаванне школы. Змены ўносіліся ад самага пачатку яго прэзідэнцтва, калі з навучальнага працэсу былі выкінуты „нацыяналістычныя" падручнікі, і цягнуцца амаль дагэтуль, калі час навучання ў сярэдняй школе быў вернуты з 12-гадовага да 11-гадовага тэрміну.

Што ж тычыцца далучэння Беларусі да агульнаеўрапейскага так званага Балонскага працэсу, які прадугледжвае збліжэнне і гарманізацыю сістэм адукацыі краін Еўропы з мэтай стварэння адзінай еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі, то аб гэтым толькі гаворыцца, прычым не вельмі гучна.

Праўда, той, для каго набыццё ведаў з'яўляецца больш важным за атрыманне дыплома, знойдзе шляхі рэалізаваць свае амбіцыі. У нечым яму можа дапамагчы сайт, які носіць неардынарную назву „Адукацыя — стыль жыцця" і месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://adukacyja.info.**

Вонкава сайт выглядае даволі сціпла, хоць і прываблівае вока аранжавым колерам. Тут няма нейкіх аздабленняў кшталту здымкаў невядомых вясёлых навучэнцаў, але інфармацыя, якая месціцца на партале, дае нагоду прызнаць, што людзі, якія жывуць таксама і ў Беларусі ўсё ж маюць магчымасць атрымаць сусветна прызнаную адукацыю.

Галоўная старонка сайта з'яўляецца адначасова стужкай навінных паведамленняў, якія з большага з'яўляюцца абвесткамі аб адкрыцці тых ці іншых курсаў у розных краінах свету. Напрыклад, вучні апошніх класаў могуць атрымаць дадатковае навучанне ў ЗША гэтай зімой, паступіўшы ў „Зімовую школу «Федэралізм і кіраванне» 2011". Таксама за акіянам прапануюць творцам і менеджарам культуры з Еўропы прайсці адпаведную стажыроўку. А ўсе зацікаўленыя могуць выпрабаваць сябе ў „Конкурсе інавацыйных праектаў у сферы інтэрнэт-тэхналогій Web Ready", што мае быць у Расіі.

На сайце — некалькі рубрык. Адна з іх — „Даведнік" — распавядае пра разнастайныя праграмы замежнага навучання, якія дзейнічаюць стала. Гэта праграма „Моладзь у Дзеянні" ад Еўрасаюза, DAAD (нямецкая служба акадэмічных абменаў), амерыканская Muskie Program. Таксама на гэтай старонцы прыводзяцца рэйтынгі ўніверсітэтаў Германіі і Вялікабрытаніі.

Для тых, хто ўпершыню сутыкаецца з магчымасцю атрымання ведаў далёка ад дому, карыснай будзе старонка „Парады". Там, у форме пытанняў і адказаў, распавядаецца пра тое, як, напрыклад, напісаць рэкамендацыйны ліст, падрыхтавацца да сумоўя, падаць заяўку на атрыманне стыпендыі, альбо што такое TOEFL.

Сайт мае даволі зручны пошук, якому адведзена цэлая старонка. Патрэбнае слова можна там шукаць не толькі па ўсім сайце, але і па асобных яго рубрыках.

Таксама прадугледжана падпіска на навіны гэтага адукацыйна-даведачнага партала. Каб стаць ягоным пастаянным карыстальнікам, трэба пакінуць адрас сваёй электроннай пошты на старонцы „Падпіска".

А вось старонка „Кантакт" мала адпавядае сваёй назве. Дзякуючы ёй можна толькі адаслаць электронны ліст да ўладальнікаў гэтага карыснага сайта, якія не жадаюць нават неяк абазначыць сябе. Тлумачэнняў, з нагоды чаго такая канспірацыя, там таксама няма.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Кастрычніцкія „астры"

У сувязі з паскораным графікам выхаду гэтага нумара пры падвядзенні вынікаў месяца „за кадрам" застануцца некалькі апошніх дзён кастрычніка. Таму дамовімся, што пры значных падзеях яны будуць адлюстраваны ўжо ў лістападзе. А пакуль па традыцыі вызначым лепшых за мінулы каляндарны адрэзак. Камандай кастрычніка сярод мужчын без ваганняў можна назваць моладзевую зборную Беларусі па футболе, якая трэці раз у суверэннай гісторыі прабілася ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы. Прычым зрабіла гэта, выявіўшы рэдкую волю і выбіўшы ў накаўт-раўндзе не абы-каго, а Італію. Добрых слоў зноў заслугоўвае і барысаўскі БАТЭ, які, пасля вікторыі над тыраспальскім „Шэрыфам", узначаліў табліцу сваёй групы ў Лізе Еўропы. Ну а ў жанчын бліскуча выступіла баскетбольная зборная — 4-е месца на чэмпіянаце свету! Выдатныя вынікі паказалі і акрабаты, якія ўзялі 8 медалёў (5 залатых, 1 сярэбраны, 2 бронзавыя) на камандавым першынстве кантынента, які прайшоў у Жэшаве. А нашы самбісты заваявалі 4 медалі на этапе Кубка свету ў Маскве.

Далей адлюструем галоўныя індывідуальныя поспехі. На пачатку пра нашых „астраў"-спартовак.

1. Алена Леўчанка (баскетбол) на чэмпіянаце свету ў Чэхіі па заслугах была прызнаная лепшай цэнтравой.

2. Вікторыя Азаранка (вялікі тэніс) выйграла галоўны прыз на Кубку Крамля. У фінале яна адолела расіянку Марыю Кірыленка — 6:3, 6:4. Гэта ўжо 5-ы асабісты прыз на вышэйшым роўні ў кар'еры Азаранкі. Да гэтага яна перамагала ў Брысбене, Мемфісе, Маямі і Стэнфардзе.

3. Вікторыя Чайка (стральба) узяла серабро ў фінале Кубка свету ў практыкаванні з пнеўматычнага пісталета (дыстанцыя 10 м).

4. Вольга Гаварцова (вялікі тэніс) разам з тайванкай Чыаюн Шуань перамагла ў парным разрадзе на турніры ў Пекіне.

5. Вікторыя Паўловіч (настольны тэніс) спынілася ў кроку ад фіналу адзіночнага разраду на турніры серыі „Pro Tour" у Венгрыі, а разам з расіянкай Святланай Ганінай у пары стала другой.

6. Святлана Коўган (бег) выйграла міжнародны марафон у сталіцы Румыніі Бухарэсце.

7. Кацярына Радзевіч (самба) заняла 2-е месца на этапе Кубка свету (катэгорыя да 72 кг).

Не забракла дасягненняў у кастрычніку і беларускіх мужчын-спартоўцаў.

1. Дзмітрый Каспяровіч (спартовая гімнастыка) адзіны з беларусаў здолеў трапіць на п'едэстал на чэмпіянаце свету, заняўшы 3-е месца ў апорным скачку.

2. Сяргей Мартынаў (стральба) заваяваў золата ў фінале Кубка свету ў практыкаванні з малакаліберная вінтоўкі (дыстанцыя 50 м лежачы). Прычым у кваліфікацыі ён паўтарыў абсалютны сусветны рэкорд — 600 ачкоў з 600 магчымых.

3. Віталь Ахраменка (муай тай) стаў пераможцам турніру ў вагавай катэгорыі звыш 80 кг на турніры ў Казані „Баі па правілах TNA на кубак TATNEFT". У фінале ён пабіў Ашвіна Балрака з Нідэрландаў.

4. Віталь Цецераў (шахматы) на сусветнай алімпіядзе паказаў найлепшы вынік на 3-й дошцы. Мужчынская зборная Беларусі заняла высокае 14-е месца сярод 149 краін.

5. Іван Троцкі (спартовая хада) выйграў сур'ёзны турнір у Італіі на дыстанцыі 50 км.

6. Андрэй Талашка (спартовая хада) там жа ўзяў другі прыз.

7. Андрэй Касціцын (хакей) тройчы ў складзе „Манрэалю" за гэты перыяд прызнаваўся першай зоркай матча, пабіў рэкорд выніковасці сярод беларусаў за ўсю гісторыю і нацэлены на новыя вяршыні.

Чакаем лістападаўскага „ўраджаю".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

У Дубічах

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

З Дубічамі-Царкоўнымі меў я нагоду пазнаёміцца ў шасцідзесятыя гады, калі ездзіў з кінаперасоўкай. Адгэтуль выходзіў мой пакойны сябра Янка Блізнюк, член „Лявоніхі". З гэтай жа вёскі і старшыня Літаратурнага аб'яднання „Белавежа" Ян Чыквін ды ягоны брат Мікалай, шматгадовы старшыня мясцовага самаўрада і актыўны грамадскі дзеяч. Тут упершыню арганізавалася „Салідарнасць індывідуальных земляробаў", якая значна паўплывала на перамены ў гміне ў пачатках трансфармацыі. Тут жыве Мікалай Панфілюк, шматгадовы карэспандэнт „Нівы".

У 1960-х гадах дубіцкая школа змяшчалася насупраць царквы ў невялічкім драўняным будынку і была адзінай культурнай установай на патрэбы грамадства. Кіраўніком быў Юрка Койла. З настаўнікаў запамяталіся Насковіч з Кляшчэляў і Юрка Несцярук, які займаўся фатаграфіяй у школьным кружку. Паводле правілаў супрацьпажарнай бяспекі зала была прызначана на 35 гледачоў, але заўсёды было іх больш. Таму пры большай колькасці публікі вымушаны мы былі ладзіць дадатковыя сеансы.

Калі мы заязджалі у вёску з кінаперасоўкай, тады я заходзіў на плябанію і праводзіў вольны час з Янкам Блізнюком, а з часам стаў яго пастаянным госцем. Меў я нагоду гасцяваць у святочнай кампаніі на Пятра і Паўла. Пасля мае кантакты абарваліся. Пра Дубічы адно даведваўся я з Панфілюковых допісаў. Апошнім часам і гэтай магчымасці не стала. Наш стойкі карэспандэнт спыніў публіцыстычную дзейнасць. А шкада, бо ў Дубічах шмат перамянілася і тэм для допісаў хоць адбаўляй...

У Дубічы трапіў я 28 верасня — удзельнічаў у пахаванні жончынага пляменніка з Грабаўца. Паколькі вёска належыць да Дубіцкага прыхода і там знаходзіцца могільнік, дык паніхіда і пахаванне праходзілі ў царкве Прасвятой Дзевы Марыі.

Часова пакідаю царкву ды падаюся ў гміну, каб распытаць войта пра апошнія навінкі. Зразу кідаецца ў вочы знаёмы будынак даўнейшай школы. Акуратна задбаны звонку, як і ўся навакольная пляцоўка. Тут змяшчаецца мясцовы музей. Зараз жа ззаду ўзвышаецца павярховы будынак школы. Змяніла сваё абліча і вуліца, якою з кінаперасоўкай прыязджалі мы ў школу. Каструбаваты брук замяніла асфальтнае палатно. Побач красуюцца шыкарныя дамы. Колішні вясковы «склеп» замянілі некалькі сучасных крамаў. Спаглядаю на помнік савецкім воінам, які красуецца ў мясцовым парку. Чытаю надпіс на мемарыяльнай дошцы: «Wieczna chwała żołnierzom Armii Czerwonej poległym w latach 1941-1945 na terenie gminy Dubicze Cerkiewne. SPOŁECZEŃSTWO GMINY — 9 maj 1985 r.".

У цэнтры вёскі знаходзіцца мураваны будынак гміны, прадуктова-прамысловая крама, пансіянат „Кораль" ды паб. Гэта вынік дубіцкага прагрэсу ва ўмовах рынкавай эканомікі.

Па лесвіцы падымаюся ў кабінет кіраўніка самаўрада. На калідоры прыкмячаю некалькіх мужчын апранутых пасвяточнаму. Адзін з іх адазваўся:

— Калі да войта, дык часова адсутнічае. Неўзабаве пачнецца сесія...

У час кароткай сустрэчы нельга крануць нават найважнейшых спраў. Няўмольна набліжаўся пачатак сесіі.

— Прабачце, але мне пара ісці, — кідае на развітанне войт Анатоль Паўлоўскі. — Запрашаю на даўжэйшую размову. Тады і абмяркуем навінкі.

Абяцаў я ветліваму субяседніку пакарыстацца гасціннасцю і падаўся ў царкву на паніхіду. Пасля пахавання хаўтуры адбыліся ў мясцовым пабе. Варта адзначыць, што памяшканне паба, як і абслуга ды стравы заслугоўваюць пахвалы.

Так вось закончыўся мой чарговы візіт у Дубічы-Царкоўныя. Лічу, што не будзе ён апошнім.

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Станіслава Леца.

1. месца ў пустыні, дзе ёсць вада і расліннасць = 34 _ 29 _ 37 _ 41 _ 5 _;
2. дзеянне або каштоўная папера = 25 _ 31 _ 39 _ 40 _ 7 _;
3. фізіялагічнае існаванне арганізму = 15 _ 16 _ 27 _ 28 _1 _;
4. губернскі горад у Расіі на рэчцы Суры = 20 _ 19 _ 35 _ 30 _ 32 _;
5. павуцінне або інтэрнэт = 2 _ 26 _ 3 _ 4 _;
6. вялікая палка, шост = 8 _ 9 _ 22 _ 23 _ 33 _ 38 _;
7. арганічнае рэчыва ў знешнім покрыве членістаногіх (*chitinum*) = 14_13_17_18_24_;
8. не сон = 10 _ 6 _ 21 _;
9. рака Урал да 1775 года = 11 __ 36 __ 12 __ .

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 40 нумара

Арменія, арыя, Чавусы, Мядзел, год, Маркс, адмірал, Зізаній, мыш, боль, Балгарыя, міска, перац, санет, смецце, Орша.

Рашэнне: **Чым меншыя грамадзяне, тым большай здаецца імперыя.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

07.11 — 13.11

(22.03. — 20.04.) Лістапад — пераломны месяц для ўсіх Бараноў. Адвага і развага памогуць табе перамагчы ўсе праблемах. Перспектыва зарабіць немалыя грошы дадасць табе энергію і запал. Пагражае табе нават іх лішак!

(21.04. — 21.05.) Глядзі ўперад, не азірайся! Фартуна прыспешвае! Не бойся рызыкі! Але не ідзі напрасткі, не камбінуй. Вельмі ўдалыя падарожжы, сустрэчы. Ды прыкрасці, якія сустрэнуць цябе 7-11.11., пахіснуць тваю веру ў людзей, на шчасце не ва ўсіх.

(22.05. — 22.06.) Не ангажуйся ў ніякія інтрыгі; хтосьці схоча цябе выкарыстаць. Усё можа трапіцца — калі каханне, дык захапляючае і ў кожным плане незвычайнае, калі грошы — дык большыя чым думаеш. Можаш смела планаваць!

(23.06. — 23.07.) Проста незямныя жарсці! Кампліменты і салодкія слоўцы адкрыюць перад табою ўсе сэрцы. Хоць будзеш хадзіць з галавой у хмарах, не перашкодзіць табе гэта ў прафесійных поспехах. Маеш шанц разгарнуць свой бізнес. Бярыся за справу і смела плануй!

(24.07. — 23.08.) Бліснуць твае таленты і ўмеласць кіравання. Здабывай усё, чаго прагнеш. Раз будзеш шчаслівым, другі — марудным. Але халады не астудзяць выбухаў пачуццяў у тваім сэрцы.

(24.08. — 23.09.) Не круці і не мані. Да 9.11. найлепшы час для прафесіі, падарожжаў, карыснага інвеставання грошай. Эксперыментуй на працы, на ложку; адвагі дадуць табе планеты і... цікаўнасць. Не падвядуць сябры. Лёгкая і прыемная праца, многа свабоднага часу, а прытым грошы!

(24.09. — 23.10.) Спадзявайся цікавых выклікаў на працы і ў каханні, якія прыспешаць сэрцабіццё. Не наракай на перашкоды — яны прымусяць цябе да пошукаў новых дарог і магчымасцей. Не жыві ўспамінамі. Жыццё ў спешцы. Хоць спакойна перакусі!

(24.10. — 22.11.) Цікавы раздзел у тваім прафесійным жыцці. Прапановы будуць сыпацца як з рога дастатку! Давярай прадчуванням, тады трапна ацэніш сітуацыю і настроі іншых. У каханні амаль ідылія — з найбліжэйшай асобай будзеш еднасцю і целам, і душою. Вызначай амбітныя мэты. Новыя шанцы ад лёсу. Выйдзі насупраць зменам.

(23.11. — 22.12.) Надышоў час жыццёвых парадкаў — бярыся за іх з усмешкай. Мноства ўражанняў; не бойся шалёнага тэмпу — знойдзеш у ім адвагу і ўласную сілу. Хто не развіваецца, той ідзе назад. Не ганіся за марай; бяры тое, пры чым будзеш адчуваць бяспеку.

(23.12. — 20.01.) Вакол цябе вялікі рух; чакай ваблівых прапаноў, цікавых магчымасцей, новых выклікаў. Выстартуеш сціпла, ды чакае цябе цудоўная ўзнагарода. Да 10.11. будзеш мець асаблівую нагоду, каб заззяць і паказацца сярод людзей, на якіх табе залежыць. Усё ж, досыць спакойная першая палова месяца. З 13.11. чакаюць цябе рэдкія нагоды і магчымасці.

(21.01. — 19.02.) Без апасак бярыся за цяжкія выклікі. Давярай інтуіцыі. Чыёсь халоднае сэрца пачне біць для цябе. Да 9.11. удачлівыя выпадкі, відны старт новага плана і нойдуць на цябе геніяльныя ідэі. Да 8.11. пазбягай абяцанняў і не гавары пра амбітныя планы. 7-11.11. — не вельмі добра з новымі сувязямі; цяжка паразумецца з партнёрам.

(20.02. — 21.03.) 7.11. добры момант, каб заняцца рэалізацыяй задумы, на якой табе асабліва залежыць. Не пільнуйся версіі мінімум! Калі хутка зловіш нагоду і выстартуеш з амбітнай задумай, дык пакажаш іншым, што зможаш! У каханні пара развітацца табе з чымсьці, што здаўна падрэзвае табе крылы. Павер — Рыбы таксама лятаюць!

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Марыя і Сяргей Нічыпарукі з нявесткай Іааннай з Буд каля Белавежы

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

НАЙБОЛЬШ ДБАЮЦЬ АБ ХАТУ ПАД ПУШЧАЙ

— У вясковым краявідзе Падляшскага ваяводства ўсё яшчэ дамінуе драўлянае будаўніцтва, якое належыць да найдаражэйшых культурных каштоўнасцей нашага рэгіёна, — адзначыў Яраслаў Дважанскі, маршалак Падляшскага ваяводства, галоўнага арганізатара, разам з Музеем сельскай гаспадаркі імя Кшыштафа Клюка ў Цеханоўцы, конкурсу „На найлепш захаваны помнік вясковага драўлянага будаўніцтва ў Падляшскім ваяводстве". — На жаль, апошнія дзесяцігоддзі прынеслі ў тым плане істотныя змены, у выніку якіх драўніна штораз радзей ужываецца ў якасці будаўнічага матэрыялу. Рэдка трапляюцца выпадкі, калі новаўзводжаныя аб'екты спасылаюцца сваім выглядам на мясцовыя формы рэгіянальнай архітэктуры. Таму кожная форма аховы драўляных будынкаў помнікавага значэння адыгрывае вельмі важную ролю ў захаванні нашай рэгіянальнай спадчыны для будучых пакаленняў. Ключавую ролю ў ахове драўлянага будаўніцтва адыгрывае пытанне змены ментальнасці ўласнікаў гэтых аб'ектаў. Захаванне традыцыйнай архітэктуры служыць утрыманню культурнай тоеснасці Падляшша. Неабходнае таксама ўсведамленне мясцовых самаўрадаў — толькі актыўны ўдзел у захоўванні будынкаў-помнікаў можа прынесці поспех у гэтай справе.

Да конкурсу былі заяўлены 72 аб'екты, між іншым аж 53 хаты. З гаспадарчых будынкаў — 2 стадолы, 7 свірнаў і 3 інвентарскія будынкі. Іншыя аб'екты гэта 2 ветракі, пажарнае дэпо, лесніччоўка, будынак вакзала і 2 вясковыя святліцы. Знаходзяцца яны на тэрыторыі дзесяці паветаў (23 гмін). У шостым выданні конкурсу найбольш аб'ектаў было заяўлена з Гайнаўскага павета (агулам 30), з Беластоцкага (19) і Высока-Мазавецкага (9), з Монецкага і Сейненскага паветаў — па 4 будынкі, Сакольскага — 2, ды з Аўгустоўскага, Граеўскага, Кольненскага і Сямятыцкага — па адным аб'екце.

— На карце Падляшша на Гайнаўшчыне аж густа ад значкоў, памечаных як месцы скарбаў будаўнічага драўлянага майстэрства і беражлівага іх захоўвання, — заявіў Антоні Масевіч, старэйшы захавальнік Музея сельскай гаспадаркі на завяршэнні конкурсу 24 кастрычніка ў Цеханоўцы. — Якраз дзякуючы руплівым пошукам і працы ў гміне асоб, такіх як Іаанна Белавежац (Чыжоўская гміна), можна гаварыць аб поспеху адкрыцця скарбаў драўлянага будаўніцтва па вёсках.

У большасці гэта будынкі з XX стагоддзя (да 1956 г. пабудовы). У XIX ст. пабудаваны былі 8 аб'ектаў, прычым у 4 недакладнае датаванне. Найстарэйшыя будынкі заяўленыя на конкурс гэта хата ў Будах з 1836 г. (перанесеная з Дабрывады) ды свірны ў Крэйвянах і Відугерах. Да найстарэйшых аб'ектаў прылічыць можна стадолу ў Сабятыне. У 1901-1918 гг. пабудаваных было 7 аб'ектаў. Толькі ў трох выпадках (Буды, Трасцянка, Новае Ляўкова) будынкі маюць яшчэ страху, часцей крытыя яны цэментавай ці керамічнай дахоўкай, а ўжо найбольш паўсюдным пакрыццём даху з'яўляецца бляха. Пры ацэнцы прымаліся пад увагу ўнутраная планіроўка будынка, захаваныя схемы падзелу, вокны, архітэктурныя аздабленні, мэбля, шалюнак. Будынкі былі і тыпова скансэнаўскія, а таксама менш ці больш мадэрнізаваныя. У шмат якіх выпадках няўмела праведзеныя рамонты значна панізілі архітэктурныя каштоўнасці паасобных аб'ектаў.

Першае месца заняла гаспадарка складзеная з хаты, стадолы і інвентарскага будынка ў Будах, 41, Белавежскай гміны — уласнік Аляксандр Нічыпарук (сын Сяргея і Марыі Нічыпарукоў). Тры другія месцы: хата ў Мосцісках, 9, Міхалоўскай гміны — уласнік Пётр Стшалкоўскі; будынак пажарнага жэпо ў Шчучыне — уласнік Гарадская ўправа Шчучына; стадола ў Сабятыне, 76, Мілейчыцкай гміны — уласнік Дарыюш Зіневіч (спадчыннік Зофіі Кісель). Пяць трэціх месцаў: хата на калёніі Давідовічы, 24, Заблудаўскай гміны — уласнік Юры Андраюк (захаваў ён між іншым карціны славутага Зэнка); хата ў Астраўках, 10, Заблудаўскай гміны — уласніца Данута Грыгарук; хата ў Ракавічах, 19, Чыжоўскай гміны — уласніца Марыя Кучко; хата ў Паўлах, 90, Заблудаўскай гміны — уласніцы Таіса Станкевіч і Люба Ануфрыюк; лесніччоўка ў Пшэвалянцы, 3, Ясяноўскай гміны — уласнікі Моніка і Адам Віткоўскія. Узнагароды — адпаведна па 6 тыс. зл., 3 тыс. зл. і 1,7 тыс. зл. Кожны з узнагароджаных будынкаў атрымае адмысловую табліцу з гербам Падляшша (Арол з Пагоняй) і інфармацыяй аб тым, што з'яўляецца ён каштоўнасцю. Вылучаны былі таксама: хата ў Плянце, 41, Нараўчанскай гміны — уласніца Лена Харкевіч; хата ў Дубінскай Ферме, 1, Гайнаўскай гміны — уласнікі Крыстына і Багдан Дэптулы; хата ў Чыжах, 49 — уласніца Вера Ляўчук; хата ў Махнатым, 10, Гайнаўскай гміны — уласнік Аляксей Лаеўскі; чыгуначны вакзал у Тракішках, Пунскай гміны — уласнік ПКП; хата ў Радзішэве-Сеньчух, 6, Цеханавецкай гміны — уласнікі Багдан Радзішэўскі, Рышард Радзішэўскі і Крыстына Лукашук; хата ў Крыніцкіх, 14, Заблудаўскай гміны — уласнік Юзаф Савіцкі; хата ў Новаберазове, 102, Гайнаўскай гміны — уласніца Валяніцна Себестыянік.

З немалой зайздрасцю спаглядала камісія, асабліва спадар Антоні (родам з Ліды), на скарбы, якія захоўваюцца беражлівымі гаспадарамі, маючы на думцы зборы свайго музея, асабліва беларускія. І з гонарам адзначаў: „Не, казалі бабулькі — гэта нельга забраць з хаты, бо ўнук не дасць!". Беларускія зборы Цеханавецкага музея аднак пабагацеюць: бабуля Люба Ануфрыюк прывезла дзве шлюбныя сукенкі, пашытыя з паркалю (шлюб быў у 1937 г. і ў 1941 г.) ды боцікі з цялячай шкуркі, пашытыя бацькам, у якіх сама вянчалася. А стадола пакойнай Зосі Кісель з Сабятына будзе размешчана побач беларускай хаткі (з Сакоў); музей паставіць тут яшчэ і царкоўку.

Вельмі хваляваліся, асабліва найстарэйшыя ўдзельніцы конкурсу — бабулі Марыя і Люба, абедзве ў квяцістых хустачках. Цяпер драўлянае — не знак беднага! Марыя Кучко мые сцены ў сваёй хаце, як калісьці, перад святам, аж блішчаць. Іконы ў яе ў самою вышываных ручніках, на ложку — капы, падушкі, лялькі... На падлозе — тканыя дываны. З гонарам цяпер гляне праз колішнія, твохстворкавыя аконцы, аздобленыя звонку разьбой... Ды калі б не Ася Белавежац, і не падумала б, каб сваю звычайную хатку заяўляць на такі конкурс.

Сучасную, ганаровую свядомасць мае Сяргей Нічыпарук, які з жонкай і сынамі трымае гаспадарку Сяло Буды.

— Сяло Буды, якое я калісьці выдумаў, высніў у снах, не атрымала б сённяшняй узнагароды, калі б да яго ўзнікнення і трывання не прыклала рук яшчэ шмат іншых асоб. І не толькі асоб. Часта, калі наведваюць нас госці і ўваходзяць на тэрыторыю невялікай гаспадаркі, што на абочыне вёскі, як калісьці густа на хутарах — пераносяцца ў цэнтр былога часу — часу нашых продкаў, часам вельмі адлеглага. Найстарэйшым маім продкам, пра якога ведаю, з'яўляецца мой прадзед. На вачах маіх і маіх аднагодкаў вёска радыкальна змянілася. Сяло Буды, як і іншыя пушчанскія вёскі, бурліла жыццём. Была поўная дзяцей, моладзі, старых. Была поўная розных стварэнняў. Цяпер у гэтай вёсцы няма ні адной каровы. А ў гэтай вёсцы жыло 70 сем'яў. Засталіся ў ёй два пеўні і адзін конь. Няма старых, што трапалі льняныя галоўкі малых і навучалі іх жыццю (...). Немагчыма весці аграгаспадарку камерцыйна — без душы. Даказваем пры нагодзе тое, што нашы культура, традыцыя і гісторыя годныя таго, каб іх падтрымліваць. Яшчэ нядаўна адчувалі мы сябе людзьмі другой катэгорыі — бо паходзілі з тэрыторыяў убогіх, драўляных, саламяных. Гэтыя каштоўнасці, якія мы падтрымліваем, як жа шукаюцца цяпер у свеце! У гэтай хатцы ляжаць дзве памятныя кнігі, запісаныя словамі захаплення людзей з усіх кантынентаў. Прыйшлі і аддалі яны паклон таямнічаму будаўніку гэтай хаты. Апынулася яна ў нас боскім цудам. У час пабудовы нашага скансэна адзін з нашых сыноў ехаў на разведку па навакольных, прыпушчанскіх, адміраючых вёсках. І, праязджаючы праз адну з іх, убачыў чалавека, які з бензапілой стаяў у задуменні пры гэтай узнагароджанай хаце. Прытармазіў, пачаў размову з чалавекам, і праз гадзіну яны старгаваліся. Адкупіў гэту хату, ужо без столі і падлогі, бо гаспадар іх спаліў у печы, за тысячу злотых...

У цэтры Марыя Кучко з Ракавіч і Люба Ануфрыюк з Паўлаў

У гэтай старадаўняй хатцы з Кляшчэлеўскай гміны, пасаджанай на фундаменце са свабодна пакладзеных камянёў спалучаных мурарскім растворам, сцены пабудаваныя на зруб, з рагамі бэлек высунутымі на канцах па-за плошчу сцен. Дах у хаце мае тыповую ў дзевятнаццацівечных падляшскіх хатах канструкцыю дымнікавага тыпу, якая выводзіцца яшчэ з курных хат. Звяртае ўвагу таксама кухня з хлебнай печчу і каптуром, з адкрытым горнам (без жалезных блях). Ды асабліва цікавы тут захаваны драўляны комін пабудаваны на зруб. Як кажуць спецыялісты — такога нідзе больш не знойдзеш ва ўсёй краіне!

Драўлянае — гэта не бяда і нястача. Гэта гонар і карысць. Гэта пераконвае і заахвочвае.

ISSN 0546-1960